Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-3 да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нонпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нонпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нонпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 173 (2361) Субота, 28-га ліпеня 1928 г.

Вакол польска-літоўскага канфлікту.

Літоўскі ўрад запрапанаваў польскаму ўраду склікаць між 15—20 жніўня пленарнае пасяджэньне літоўскае і польскае дэлегацыі ў Кёнігсбэргу. Гэта пасяджэньне павінна будзе падрахаваць вынікі працы трох камісій, утвораных на падставе пастановы Кёнігсбэрскае канфэрэнцыі ў сакавіку гэтага году. Гэтыя вынікі, нажаль, зьяўляюцца малаўсьцешнымі. Канфэрэнцыі прыдзецца сьцьвердзіць, што па асноўных пытаньнях, а ўласна па пытаньні аб заключэньні дагавору аб ненападзе, а таксама па эканамічных і транспартных пытаньнях згоды не ўдалося дасягнуць. Толькі камісія, пасяджэньні якой адбываліся ў Бэрліне, аказалася больш шчасьлівай. Вынікам яе працы зьяўляецца парафіраваная канфэрэнцыя аб мясцовых пагранічных зносінах.

Такі вынік працы польска-літоўскіх камісій яшчэ больш абвастрае і без таго напружанае становішча, якое стварылася за апошні час у польска-літоўскіх дачыненьнях. Польшча ўмела выкарыстоўвае тую няўступчывую пазіцыю, якую, як відаць, па меркаваньнях унутранае палітыкі быў вымушан заняць літоўскі ўрад для таго, каб прадставіць Літву віноўніцай абвастрэньня польска-літоўскіх дачыненьняў і апраўдаць падрыхтоўваемае ёй гвалтоўніцкае вырашэньне «літоўскае праблемы»

Блізкі да ўраду кракаўскі «Час» піша з дастатковай шчырасьцю, што неабходна кончыць, нарэшце, з Літвою, бо Літва да гэтае пары перашкаджала ўтварэньню блёку прыбалтыцкіх дзяржаў з Польшчаю. Уплывовыя польскія колы лічаць, што надышоў час для ажыцьцяўленьня даўно задуманых плянаў. Лейб-орган пілсудчыкаў «Глос Правды» заяўляе: «Ці можна паставіць пад пагрозу справу міру для фантазіі жменькі «ковеньшчыкаў»? Калі Вольдэмарас жадае, каб над ім быў учынен гвалт, дык ці ня трэба як хутчэй задаволіць яго жаданьне?».

Гэтыя пагрозы не абмяжоўваюцца газэтнымі артыкуламі: У раёне Вільні назначаны манэўры 4-х пяхотных дывізій і 1 кавалерыйскае брыгады, г. зн. сіл, у кожным выпадку ня ўступаючых усёй літоўскай арміі. 12-га жніўня на зьезд легіёнаў прыбывае Пілсудзкі, які, такім чынам, да моманту Кёнігсбэрскае канфэрэнцыі будзе знаходзіцца ля парогу Літвы з пагражаючым ваенным кулаком. Прадэманстраваўшы сваю «міралюбнасьць», Польшча цяпер будзе «вымушана» ўжыць зброю з прычыны літоўскае „ўпартасьці“.

Вось становішча польска-літоўскага канфлікту, якое пагражае ў блізкай будучыне новымі сур'ёзнымі ўскладненьнямі.

Якую-ж пазіцыю займаюць вялікія дзяржавы і што робяць яны для таго, каб папярэдзіць пагрозу вайны на ўсходзе Эўропы?

Рыхтуючыся да падпісаньня дагавору аб адмове ўжываць вайну, як «сродак нацыянальнае палітыкі», вялікія дзяржавы ў гэты самы час адкрыта падтрымліваюць агрэсыўныя замыслы Польшчы супроць Літвы. На апошняй сэсіі рады Лігі Нацый Літва аказалася зусім ізаляванай. З вуснаў Чэмбэрлена яна пачула, што яе паводзіны правакацыйныя. Бонкур прапанаваў вызначыць тэрмін, у які яна павінна капітуляваць перад польскімі патрабаваньнямі. Даволі прагледзець старонкі кіраўнічых органаў французскай і ангельскае прэсы за апошні час, каб пераканацца, што агрэсыўныя замыслы Польшчы сустракаюць поўнае падтрыманьне кіраўнічых дзяржаў Лігі Нацый. Гэтыя дзяржавы рыхтуюць тыя абставіны, пры якіх Польшчы, магчыма, ня прыдзецца ўжываць мэтады Жэлігоўскага. Сваёй мэты яна зможа дасягнуць у якасьці «абаронцы міру і справядлівасьці» пры поўным захаваньні статуту Лігі Нацый і пры падтрыманьні і апякунстве вялікіх дзяржаў і Лігі Нацый.

На верасьнёўскай сэсіі Лігі Нацый польска-літоўскі канфлікт будзе стаяць у парадку арт. 15. Па гэтым артыкуле пры галасаваньні рэзалюцыі, (а рэзалюцыя, будзе, зразумела, не ў карысьць Літвы) ня прымаюць удзелу зацікаўленыя бакі. Такім чынам, ухіляецца ад становішча, якое атрымалася на чэрвеньскай сэсіі, калі пытаньне разглядалася па арт. 11 і калі рэзалюцыя ня магла быць прынята, бо супроць яе галасаваў Вальдэмарас. Калі нават ня ўдасца дамагчыся аднагоднае пастановы, дык і тады небясьпека гвалту над Літвою зусім ня зьнішчаецца.

У зьвязку з абвастрэньнем польска-літоўскіх дачыненьняў Ліга Нацый выступае, як непасрэдная зброя Польшчы і вялікіх дзяржаў для гвалту над Літвой.

Мы ўжо ня раз мелі магчымасьць выказаць свой пункт погляду на польска-літоўскі канфлікт. Мы горача жадаем ліквідацыі гэтага канфлікту пры ўмовах захаваньня суверэннасьці Літвы пры роўных правох дагаворных бакоў. Мы не салідарызуемся з пазіцыяй, якую займае ў сучаснай спрэчцы літоўскі ўрад. Мы лічым, што гэтая пазіцыя шкодзіць самой Літве і выкарыстоўваецца супроць яе ворагамі літоўскае незалежнасьці.

Розьніца між нашай пазіцыяй і пазіцыяй вялікіх дзяржаў у тым, што мы сапраўды хочам міру, згоды між Польшчай і Літвой і захаваньня незалежнасьці Літвы, а ня ўжываньня права моцнага ў польска-літоўскім канфлікце. І кожнаму павінна быць ясна, што нам не па дарозе з дзяржавамі, якія, падбухторваючы Варшаву на агрэсыўныя крокі супроць Літвы, у Коўні раdзяць умеранасьць і рэкамэндуюць прыняць польскія прапановы.

Пагроза вырашэньня польска-літоўскага канфлікту ўзброенай сілай прымушае ўсе дзяржавы выявіць свае сапраўдныя намеры і зрывае маскі фальшывае міралюбнасьці. Хто сапраўды хоча міру, дык той павінен ужыць усе захады, каб не загучэлі гарматы на польска-літоўскай граніцы. Польска-літоўскі канфлікт мае больш, чым сямігадовую гісторыю. Увесь гэты час мір не парушаўся, ня гледзячы на ўсю вострасьць становішча. Ён ня будзе парушан і цяпер, калі будуць стрыманы агрэсыўныя элемэнты, якія хочуць вырашыць гістарычныя праблемы мячом.

Забастоўка польскіх гарнякоў.

ВАРШАВА, 26-VII. Учора адбылася дэманстратыўная аднадзённая забастоўка ва ўсіх вугольных раёнах Польшчы. У Дамброўскім раёне сабастоўка была поўнай, у Верхняй Сілезіі —толькі частковай.

VI кангрэс Камінтэрну.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ т. БУХАРЫНА.

На ранішнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 26-га ліпеня цягнуліся спрэчкі па дакладу т. Бухарына.

Т. Вікс (ПАЗШ):

«Сьмешна вінаваціць ЦК амэрыканскай кампартыі, як прабуюць гэта рабіць некаторыя таварышы ў рэкламаваньні амэрыканскага імпэрыялізму толькі дзеля таго, што ЦК у поўнай згодзе з тэзісамі Бухарына ацэньвае амэрыканскі імпэрыялізм, які знаходзіцца ва ўзрастаючай стадыі. Камінтэрн павінен дапамагчы Цэнтральнаму Камітэту скончыць з фракцыйнай барацьбой апазіцыі".

Т. Хайдар (Палестына):

«Эўрапейскі пралетарыят павінен удзяляць больш увагі праблемам Эгіпту і Аравіі».

Т. Като (Японія):

„Японская кампартыя, з часу рэарганізацыі ў 1927 годзе, ідзе па правільным шляху, як праўдзівая бальшавіцкая пралетарская партыя».

Т. Хорскі (Чэха-Славакія):

«Чэха-славацкая кампартыя дапусьціла шмат памылак у сялянскім нацыянальным пытаньні. Памылкі павінны быць выпраўлены пры дапамозе Камінтэрну".

Т. Петрулеску (Румынія):

«Сёньня маем новае кіраўніцтва у партыі, складзенае з лепшых пралетарскіх элемэнтаў, але патрабуючых жывога падтрыманьня з боку Камінтэрну, у сувязі з стаячымі перад намі задачамі».

Т. Ру (Паўднёвая Афрыка):

„Кампартыя павінна выкарыстаць растучае незадавальненьне мясцовых рабочых і перашкодзіць уваход рэфармістам у паўднёва-афрыканскі работніцкі рух".

Т. Ракмон (Францыя):

„Галоўнейшай нашай задачай—разьвіваць ячэйкі на прадпрыемствах, ствараць фракцыі прафсаюзаў, весьці энэргічную барацьбу супроць рэфармісцкіх лідэраў, кіраваць барацьбой за павялічэньне зарплаты. Штодзённая барацьба супроць вайны, асабліва супроць падрыхтоўкі вайны з СССР павінна быць зьвязана з нашай асноўнай мэтай—барацьбой пралетарыяту за ўладу".

Т. Катаяма (Японія):

«Сувязь між кампартыямі мэтраполіі, а таксама ў калёніях недастатковая. Падтрыманьне ангельскай, амэрыканскай і галяндзкай кампартыямі брацкіх партый у калёніях слабая. У інтарэсах пасьпяховай барацьбы супроць амэрыканскага імпэрыялізму дамагаемся канчатковай ліквідацыі фракцыённай барацьбы ў амэрыканскай кампартыі і большага супрацоўніцтва яе з японскай кампартыяй».

Т. Гансэн (Нарвэгія):

«Пасьпяхова праведзеная забастоўка нарвэскіх рабочых супроць трацейскага разьбіральніцтва, арбітражу і антыпрафсаюзнага закону ўзмацніла уплыў нашай партыі, якая кіравала гэтай барацьбой. Кампартыя ўвачавідкі паказала рабочым, што барацьба з арбітражам магчыма».

Т. Гарляндзі (Італія):

«Кампартыі недастаткова зварочваюць увагу на працу сярод сялянства. Нават аграрная сэкцыя Камінтэрну не выяўляе дастатковай актыўнасьці. Калі хочам завяваць сялянскія гушчы, неабходна выставіць ясную зямельную праграму».

Запатоцкі (Чэхаславакія):

«Чэхаславацкая кампартыя павінна прыкласьці шмат высілкаў на паляпшэньне працы, як сярод рэфармісцкіх прафсаюзаў, таксама і сярод рэвалюцыйных. Нам удалося ўцягнуць новых 31.000 членаў рэвалюцыйных прафсаюзных работнікаў. Што трэба аднесьці ў залік новых мэтадаў нашай працы».

Т. Піло (Францыя):

«Нашу парыскую арганізацыю вінавацілі ў скажэньні тактыкі адзінага фронту. Можам давесьці фактамі, што арганізацыя заўсёды імкнулася праводзіць тактыку адзінага фронту зьнізу: у гэтым пытаньні ня высоўвалі асобнай лініі. Патрэбна павесьці ўзмоцненую барацьбу супроць правых ухілаў асабліва ў сувязі з ваеннай небясьпекай».

На вячэрнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 26-га ліпеня ня спыняліся спрэчкі па дакладу т. Бухарына. Пасьля выступленьняў тав. Дзіксона, зазначыўшага на неабходнасьць шчыльнае сувязі між кампартыямі імпэрыялістычных краін з кампартыямі ў калёніях, і тав. Гэршэля (Чэха-Славакія), лічачага, што тэзісы Бухарына не дастаткова востра крытыкуюць памылкі чэха-славацкае кампартыі, кангрэс заслухаў прывітаньні рабочых і служачых Кашырскае райённае электрастанцыі і рабочых і служачых сялянскае газэты. Пасьля выступленьня дэлегацый, слова прадстаўляецца т. Тэльману, якому кангрэс наладжвае бурную авацыю.

Прамова т. Тэльмана.

У адказ на пагрозу вайны —мабілізацыя мас.

Нямецкая дэлегацыя - сказаў Тэльман—цалкам згодна з асноўнай лініяй тэзісаў Бухарына. У абставінах усё больш абвостранай небясьпекі вайны, нашай задачай зьяўляецца мабілізаваць масы, каб папярэдзіць пагрозы вайны, якая выцякае з аб'ектыўных умоў. Заснаваньне кааліцыйнага ўраду ў Нямеччыне сьведчыць аб тым, што нямецкая сацыял-дэмакратычная партыя стала становчым фактарам падрыхтоўкі вайны. «Форвэртс» вядзе адкрытую анты-бальшавіцкую кампанію. Барацьба супроць кааліцыйнае палітыкі зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач кампартыі ўсіх краін, дзе сацыял-дэмакратыя ўдзельнічае ва ўрадзе. Супроць нас паўстала ўся магутнасьць урадавага апарату ў капіталістычных краінах, буржуазныя партыі, правыя і левыя сацыял-дэмакраты.

Палітычны сэнс тае радасьці, з якою пралетарыят усяго сьвету рэагаваў на дасканалую выратоўчую працу лёдаколу «Красін», тлумачацца ня радасьцю наконт выратаваньня некалькіх фашысцкіх авантурыстаў, а радасьцю і сьвядомасьцю перавагі навуковых і тэхнічных дасягненьняў сацыялістычнае дзяржавы.

Рост уплываў нямецкай кампартыі.

Вынікі парляманцкіх выбараў у Нямеччыне сьведчаць аб зруху ўлева нямецкага пралетарыяту і моцным росьце ўплыву кампартыі буйнейшых прамрайёнаў. Вызваленьне пралетарскіх палітзьняволеных было дасягнута нажымам пралетарыяту. Тут з трыбуны кангрэсу выказваю глыбокую радасьць наконт звароту Макса Гельца і іншых вызваленых на фронт пралетарскае клясавае барацьбы (гучныя воплескі). Мы спадзяёмся, што здолеем хутка вырваць з вастрогу таксама Маргса і іншых пралетарскіх палітзьняволеных.

Наступ на кампартыю с.-дэмакратаў.

Сацыял-дэмакратыя адказвае на рост камуністычнага ўплыву ў пралетарскіх масавых арганізацыях нячуваным наступам, накіраваным на раскол прафсаюзаў і іншых пралетарскіх масавых арганізацый. Нашая задача мабілізаваць масы на барацьбу супроць сацыял-дэмакратычных лідэраў і за адзінства пралетарскіх арганізацый. Мы зможам тут сказаць, што апазіцыянэры ў нашай партыі канчаткова і няўхільна разьбіты (гучныя воплескі). Яны ўвайшлі часткова ў дробна буржуазныя партыі, часткова ў сацыял-дэмакратычныя партыі.

Ухілы ў кампартыі.

Затое ў нашай партыі зноў паявіліся яскрава выяўленыя правыя ўхілы. Маюцца ў наяўнасьці і ўльтралевыя ўхілы. Тым ня менш больш такіх небясьпек, як у 1924 годзе, ужо ў нашай партыі няма. Нашай важнейшай задачай зьяўляецца таму ўтварэньне адзінага фронту супроць правых сацыял-дэмакратычных ухілаў. Кангрэс павінен заклікаць кіраўнікоў гэтых ухілаў да парадку. Дэлегацыя УсеКП(б) уносіць у тэзісы Бухарына наступнае дапаўненьне, ухваленае большасьцю нямецкае дэлегацыі і якое я тут агалашаю з дазволу дэлегацыі УсеКП(б).

Дапаўненьне нямецкай дэлегацыі да тэзісаў т. Бухарына.

Нямецкая кампартыя, якая зьяўляецца адным з лепшых атрадаў інтэрнацыянальнае пралетарскае партыі, змагаецца супроць дасканала арганізаванае сацыял-дэмакратычнае партыі, якая пусьціла моцныя карэньні ў краіне. Гэта стварае спрыяючую глебу для ўзьнікненьня правых ухілаў унутры самога камуністычнага руху. Таму чарговая задача партыі—весьці пасьлядоўчую барацьбу супроць правых ухілаў. Бязумоўную перамогу заміраючага руху ў адносінах да гэтых ухілаў, пры аднадчасовым уцягненьні ў грамадзкую практычную працу лепшых партыйных сіл, стаячых на платформе пастаноў Камінтэрну і Эсэнскага партыйнага зьезду, пры аб'яднаньні ўсіх сіл сучаснага кіраўніцтва і ўмацаваньня яго калектыўнага характару, пры бязумоўным паднначаленьні меншасьці большасьці. У нашай партыі самакрытыка яшчэ не разгарнулася ў дастатковa шырокім маштабе. Аднак, мы не дапусьцім, каб правая групоўка выкарыстоўвала кожную памылку, як прычыну для фракцыйных нападак.

Мы ня ведаем, ці дадуць нам імпэрыялісты магчымасьць правесьці 7-ы свой усясьветны кангрэс Камінтэрну ў мірны час і ў мірных абставінах. З гэтае прычыны, у сучасны момант больш неабходна, чымсь калі-небудзь, узмоцненая праца для ўмацаваньня саюзу рабочых і сялян для дапамогі прыгнечаным каленіяльным народам і ўзмацненьне інтэрнацыянальнае салідарнасьці пад сьцягам давер'я да Камінтэрну і яго кіраўнічай партыі—УсеКП(б). Пад кіраўніцтвам Камінтэрну, пры напружаньні нашае рэвалюцыйнае энэргіі пёрамога нам забясьпечана (гучныя воплескі).

* * *

Выступленьнямі Спэктара (Канада) і Маннэра (Фінляндыя) вячэрняе пасяджэньне скончылася.

ПЕРАГЛЯД СТАТУТУ КАМІНТЭРНУ.

Кангрэс арганізаваў камісію па перагляду статуту Камуністычнага Інтэрнацыяналу. У склад камісіі абраны: Бэрнар (Францыя), Ілек (Чэха-Славакія), Самуэльс (УсеКП(б), Лаўстон (Злучаныя Штаты), Росьсі (Італія), Чжан-Куанс (Кітай), Вітковскі (Польшча), Ліманаў (КІМ) і сэкратар камісіі т. Хэймо.

Самаахвярнасьць лёдаколу „Красін“

пры выратаваньні „Монтэ Сэрвантэса“.

МАСКВА, 26-7. Намесьнік старшыні камітэту дапамогі «Італіі» т. С. Ф. Каменеў у гутарцы з супрацоўнікам «ТАСС» у зьвязку з выратаваньнем «Красіным» нямецкага параходу «Монтэ Сэрвантэс» сказаў:—дапамога, зробленая «Красіным» яшчэ лішні раз сьведчыць аб тым, што яго каманда добра падрыхтавана да самых сур'ёзных прац у самых цяжкіх умовах. Трэба яшчэ адзначыць, што ідучы на выратаваньне «Сэрвантэса», „Красін“ сам меў даволі сур'ёзныя пашкоджаньні. У яго было ў няспраўнасьці стырно, што ва ўмовах плаваньня сярод ільдоў зьяўляецца даволі сур'ёзным пашкоджаньнем. Апрача таго, у «Красіна» надламана лопасьць вінта.

«Сэрвантэс» атрымаў прабоіну, наскочыўшы на падводную скалу. Вадалазы «Красіна» спусьціліся пад ваду, высьнілі сур'ёзнасьць пашкоджаньня, пасьля чаго каманда «Красіна» прыступіла да накладаньня часовай латы на прабоіну. Гэтая «лата» аказваецца мае да 4-х мэтраў у даўжыню і каля мэтру з лішкам у шырыню. З такой прабоінай бадай бы ці ўтрымаўся параход на паверхні вады калі-б „Красін“ ня прыбыў упару на дапамогу. Накладка гэткай латы—вельмі сур'ёзная работа, якая ізноў-жа сьведчыць аб высокай падрыхтоўцы нашых вадалазаў і ўсей каманды лёдаколу.

* § *

ЛЁДАКОЛ «КРАСІН», 25-7. Капітан «Красіна» Эмге падзяліўся з карэспандэнтам ТАСС сваімі меркаваньнямі аб аказаньні дапамогі параходу «Монтэ Сэрвантэс». „Ня толькі марскія традыцыі, але і простая гуманнасьць—заявіў ён—абавязвае нас адхіліцца ад першапачатковага курсу і пасьпяшацца на сыгналы. Раней усяго, мы спрабуем дапамагчы людзям, а пасьля караблю. Для гэтага ў нашых руках ёсьць усе патрэбныя тэхнічныя сродкі. Нікольні не сумняваюся, што нам пашчасьціць выканаць свой абавязак".

Захапленьне „Красіным“ у Нарвэгіі.

Па атрыманых з Нарвэгіі даных вестках аб заходзе «Красіна» для рамонту ў нарвэскі порт Савангэр выклікала энтузіязм па ўсёй краіне. Для спатканьня «Красіна» ў Савангэр прыяжджаюць ня толькі нарвэскія карэспандэнты, але і карэспандэнты ўсіх краін Эўропы.

Як спаткалі „Чыта-ды-Міляно“ ў Нарвіку.

ОСЛО, 26-VII. «Чыта-ды-Міляно» раніцою прышла ў Нарвік з удзельнікамі канцавоснай трагэдыі, якія засталіся жывымі. У момант прыбыцьця параходу, на ўзьбярэжжы было параўнаўча мала народу. Нарвэскае ўлады ня было. Калі былі кінуты снасьці, ніхто з прысутных на ўзьбярэжжы не дапамог стырну прышвартавацца, так што нехаця прытлося зрабіць аднаму з экіпажаў, які выскачыў на бераг. Па прыходзе, апрача выратаваных італьянцаў, аказалася таксама двое немцаў, якія прымалі ўдзел у адшуканьні «Ламама». Ніхто з выратаваных ня вышаў на палубу. Як толькі былі спушчаны масткі на іх быў пастаўлены вартаўнік, што выклікала ўсеагульнае зьдзіўленьне.

ПАДПІСАНЬНЕ УГАВОРУ МІЖ АМЭРЫКАЙ І КІТАЕМ.

ПЕКІН, 27-7. 25 ліпеня падпісан ўгавор між Кітаем і Амэрыкай, апублікаваны сёньня раніцой. Новы угавор аснован на ноце Амэрыкі Кітаю, якая дацiравала тым-жа 25-ліпеня. Па ўгавору Амэрыка згаджаецца адначыць мытную аўтаномію Кітаю. Фактычна ўгавор азначае прызнаньне дэюрэ нанкінскага ўраду Злучанымі Штатамі.

Дэманстрацыі ў Варшаве.

ШМАТ ПАРАНЕНЫХ

ВАРШАВА, 26-VII. Учора ў рабочых кварталах адбыліся дэманстрацыі, наладжаныя кампартыяй пад лёзунгам вызваленьня палітычных і супроць «амністыі» абвешчанай урадам. Асабліва буйныя разьмеры набыла дэманстрацыя ў рабочым квартале Павонзкі, адкуль рабочыя з разгорнутымі плякатамі рынуліся калёнамі ў напрамку да астрогу. Прыбыўшыя на грузавіках паліцэйскія атрады кінуліся на дэманстрантаў і разагналі іх. Шмат дэманстрантаў паранена. Учора-ж адбылося пахаваньне рабочых, загінуўшых некалькі дзён назад у часе выбуху на фабрыцы. На трунах ўскладзены вянкі з чырвонымі істужкамі і рэвалюцыйнымі надпісамі. На пляцу адбыўся мітынг, дзе ўдзельнічала 7 тысяч чалавек.

Японскі тэатр Кабукі ў Маскве.

МАСКВА, 26-7. У Маскву прыбыла трупа японскага тэатру Кабукі, з вядомым артыстам Санандзі на чале. Сананзі ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў, што тэатр Кабукі ўпяршыню за ўвесь час свайго існаваньня выяжджае на гастролі замежы, і першай краінай, куды ён прыехаў, зьяўляецца Савецкі Саюз—Савецкая краіна, дзе расьцьвітае тэатр, і гэта паслужыла прычынай паездкі тэатру Кабукі імвнна ў СССР.

Абвастрэньне польска-літоўскага канфлікту

„МОНДРЫ ПАЛЯК ПА ШКОДЗЕ“.

ХЛУСЬЛІВЫЯ ЗАВЯРЭНЬНІ ПТА).

ВАРШАВА, 26-VII. Ва ўчарайшых газэтах зьявіўся адказ на ноту Вальдэмараса генэральнаму сэкратару Лігі Нацый з прычыны надыходзячых манэўраў польскіх войскаў недалёка літоўскае граніцы. У зьвязку з гэтым, польскае тэлеграфнае агенцтва агаласіла паведамленьне, у якім адхіляе чуткі аб надыходзячых манэўрах польскае арміі на тэрыторыі Віленшчыны. Водлуг слоў агенцтва ніякіх манэўраў на Віленшчыне ня будзе. Толькі ў верасьні там будуць праводзіцца звычайныя ваенныя практыкаваньні, якія штогод арганізуюцца ў розных пунктах Польшчы. Думаюць, што ўрад пастанавіў адкласьці мяркуемыя манэўры пасьля атрыманьня з-за граніцы вестак аб непакоі выкліканым у некаторых заходня-эўрапейскіх краінах паведамленьнямі аб гэтых манэўрах. Зьвяртае ўвагу тая акалічнасьць, што польская прэса, галоўным чынам—блізкая да ўраду, яўна стварае ваенную атмасфэру, насычаную пагрозамі ў адносінах да Літвы. Газэты зьвяртаюць шмат увагі стычцы на польска-літоўскай граніцы, у часе якое адзін польскі салдат забіты, а другі паранены. Адначасова ў газэтах паявіліся весткі, нібы ў літоўскіх астрогах ужываюць катаваньні.

Спраставаньне хлусьні польскіх газэт.

КОЎНА, 26-7. З прычыны распаўсюджаньня ў апошні час польскім тэлеграфным агенцтвам паведамленьняў аб інцыдэнтах у раёне дэмаркацыйнай лініі, агенцтва літоўскага ўраду „Эльта“ адзначае, што польскія паведамленьні скажаюць сапраўднасьць. Што-ж тычыцца ў прыватнасьці польскага паведамленьня, нібы літоўскія стралкі, перайшоўшы на тэрыторыю Польшчы каля раёна Новыя Трокі, забілі польскага пагранічніка, то польскі салдат, труп якога знойдзены на тэрыторыі Літвы ў 2-х мэтрах ад дэмаркацыйнай лініі, забіты з польскага боку злачынцамі польскімі. „Эльта“ называе польскія весткі аб пераходах дэмаркацыйнай лініі літоўскімі стралкамі выдумкай чысьцейшай вады.

Чуткі аб падрыхтоўцы да вайны прыносяць Польшчы шкоду.

ВАРШАВА. 26-7. Кракаўская газэта «Ілюстраваны кур'ер Цодзенны» востра пратэстуе супроць нейкага „міжнароднага канцэрну фабрыкантаў ваенных прылад", які распаўсюджвае чуткі аб будучай вайне. Гэтыя чуткі, паводле слоў газэты, распаўсюджваюцца дзеля таго, каб стварыць кан'юнктуру, спрыяючую для збыту аружжа і ваеннае амуніцыі. Газэта не дапушчае магчымасьці вайны ні з СССР, ні з Нямеччынае, ні з Літвою і выказвае прыпушчэньне, што гэты канцэрн проста хоча добра зарабіць. «Гэтыя чуткі—працягвае газэта—прынесьлі аднак Польшчы шкоду, бо ў апошні час зусім спыніўся прыплыў чужазем. капіталаў у Польшчу»

Націск Англіі на Літву.

ЛЁНДАН. Чэмбэрлен паведаміў у палаце вобшчын, што ангельскаму паслу ў Рызе прапанована афіцыйна ўказаць літоўскаму паслу на пажаданасьць зьдзейсьненьня прапаноў Лігі Нацый, якія тычацца польска-літоўскіх неладоў. Чэмбэрлен даў, што па яго вестках аналёгічныя крокі будуць зроблены французскім і нямецкім пасламі.

Канцэнтрацыя шаўлісаў на пагранiччы.

«Дзеньнік Віл.» (№ 166) паведамляе, быццам на польска-літоўскім пагранiччы пачалася канцэнтрацыя аддзелаў шаўлісаў. Канцэнтрацыя мае быццам сувязь з загадам, выданым гэтымі днямі, аб перавядзеньні літоўскіх гарнізонаў на ваеннае палажэньне.

„Форвэртс“ аб польска-літоўскіх адносінах.

БЭРЛІН, 26-7. «Форвэртс» востра крытыкуе пазіцыю Літвы ў адносінах да Польшчы. Газэта напаміная, што дзяржавы даўно [illegible] мэмарандуме на тое, што так быць далей ня можа. Паводле слоў „Форвэртса", падкрэсьліваньне літоўскіх прэтэнзій на сувэрэнітэт над Віленшчынай зробіць згоду з Вальдэмарасам немагчымай. Паводле слоў газэты, Нямеччына, якая ўдзельнічала ў выпрацаваньні жэнеўскай рэзалюцыі, мае ўсе падставы ўплыць на Літву, каб апошняя зьмяніла сваю пазіцыю. Газэта „Таг" канстатуе, што апрача абодвых бакоў і Лігі Нацый, у польска-літоўскім пытаньні ў поўнай меры зацікаўлены таксама і Савецкі Саюз.

Паводле слоў газэты, СССР у першую чаргу павінен рашуча працівіцца працягу польска-літоўскіх перамоў, пад старшынствам камісара Лігі Нацый, бо па рыскаму дагавору ўсе спрэчныя пытаньні між Польшчай і Літвой павінны развязвацца выключна запікаўленымі краінамі між сабой.

НОВАЯ ВАЙНА Ў МАРОКО.

П'ЕР СЭМАР.

Французскі імпэрыялізм у інтарэсах сваёй эканомікі і экспансіі ўсё больш і больш схіляецца да палітыкі заваёў крыніц сыравіны, адшуканьня новых рынкаў, неабходных для разьвіцьця французскай прамысловасьці.

Каб дамагчыся гэтага, ён робіць усе натугі да максымальнага разьвіцьця сваёй «каленіяльнай імпэрыі», якая займае старое месца ў сьвеце.

Імкненьне павялічыць прыбыткі, якія даюць калёніі, ажыцьцяўляецца шляхам. 1) зямельнай экспрапрыяцыі тубыльнага насяленьня і перадачы вялізарных тэрыторый багатым калёністам або фінансавым таварыствам, 2) эксплёатацыя падземных багацьцяў (вугаль, жалеза, паташ) і вадаспадаў і перапродаж іх банкам і прамысловым таварыствам, 3) усё больш узрастаючай эксплёатацыі тубыльных мас.

Такім чынам, французскі імпэрыялізм праводзіць у Мароко ў працягу гадоў сваю палітыку агнём і мячом.

З часоў акупацыі гэтай краіны Францыяй у тубыльных уласьнікаў было адабрана каля 750.000 гэктараў карыснай зямлі.

Вайна з рыфамі выкрыла сапраўдны характар «мірнага прасякненьня» імпэрыялістаў і давяла, што сапраўднай прычынай яе ўзьнікненьня было імкненьне Францыі захапіць багатыя нетры і пладародныя землі гэтай краіны, бо звыш 40.000 гэктараў былі адабраны ў плямён, якія далі адпор напаўшай на іх Францыі.

Зараз, калі рыфы часова пераможаны, французскі імпэрыялізм кідае свой зрок на поўдзень, дзе плямёны, якія жывуць на схілах гор сярэдняга Атласа і Заліфэта, ня хочуць яго дапусьціць.

У гэтых вобласьцях знаходзіцца багатыя месцароды волава, жалеза, каменнага вугалю, вадасховы і вадаспады, неабходныя як для электрыфікацыі Мароко, так і для штучнага абваднення вялізарнай плошчы ў падножжы Атласу.

Захоп гэтай вобласьці неабходны французскаму імпэрыялізму таксама і для забесьпячэньня безапаснасьці зносін паміж Паўночнай Афрыкі і французскай заходняй Афрыкай ў сучасны момант, калі Францыя рыхтуецца пабудаваць шлях праз Сахару.

Павялічэньне прыбыткаў, якія дае мурынская Афрыкай, зьяўляецца адным з асноўных фактараў росквіту французскага імпэрыялізму, і непасрэдная сувязь яе з паўночнай Афрыкай праз Сахару зьяўляецца неабходнай умовай для разьвіцьця гэтых двух калёній і для аб'яднаньня як эканамічнага, так і палітычнага „французскай Афрыкі». З аднаго боку эканамічнае аб'яднаньне, непасрэдна зьвязанае з мэтраполіяй Міжземным морам, з другога боку—ваеннае аб'яднаньне мурынскай арміі, якая знаходзіцца ў стадыі арганізацыі, з паўночна-афрыканскім войскам. аб'яднаньне, якое зможа паслужыць значным падтрыманьнем арміі мэтраполіі, а, магчыма, і самастойна забясьпечыць абарону афрыканскіх калёній Францыі.

Такім чынам, пабудова шляху праз Сахару зьяўляецца неабходнай умовай для далейшага разьвіцьця «афрыканскай калёніяльнай імпэрыі», для далейшае экспансіі французскага імпэрыялізму. Гэтым і тлумачыцца ваенная кампанія, узьнятая зараз супроць плямён Атласа і Заліфэта.

Справа ідзе ня толькі аб захопе земляў, нетраў і вадаспадаў, але і аб забесьпячэньні безапаснасьці сувязі паміж абедзьвюма калёніямі, неабходнай для ўзмацненьня эксплёатацыі іх.

На поўначы Мароко зараз адбываецца нязвычайныя ваенныя манэўры —гэта экспэдыцыя, якая маштабамі працягласьцю падобна да вайны з рыфамі. Ня здолеўшы падпарадкаваць сабе гэтыя плямёны шляхам блёкады, якая пазбавіла іх у некаторых раёнах харчоў і нават вады, пасьля дарэмных спроб падкупіць іх грашыма абяцанымі іх правадыром, імпэрыялізм ужывае зараз узброеную сілу; яго мірныя настроі ажыцьцяўляюцца пры дапамозе гармат і паветраных бамбардыровак.

Тубыльцы дадуць моцны адпор гэтаму наступу французскага імпэрыялізму, для якога ўзмацненьне эксплёатацыі Мароко, як і іншых калёній, зрабілася пытаньнем жыцьця і сьмерці. Каленіяльны друк, які інспіруюць губэрнатары, праводзячыя палітыку французскага ўраду, ня скрывае, што будуць ужыты ўсе меры для поўнага «замірэньня» Мароко.

Французкі імпэрыялізм пачынае зараз упартую і сапраўдную вайну «да канца»—супроць непакорлівых плямён паўднёвага Мароко. [illegible] цыі ў гэтай вайне будзе змагацца каленіяльнае войска, у склад якога ўваходзяць пераможаныя мароканскія плямёны. Такім чынам, прэтэндуючыя на званьне «асьветнікаў» арганізуюць вайну брат на брата.

У гэтай вайне таксама, як і ў рыфскай—мы на баку «дзікіх» Атласу і Заліфэта, супроць «цывілізаваных», нацкоўваючых брат на брата для трыумфу імпэрыялістаў калёнізатараў. Мы заклікаем каленіяльных і французскіх салдат братацца з незалежнымі мароканцамі і павярнуць супроць агульнага прыгнятацеля—французскага імпэрыялізму.

ВАКОЛ КІТАЙСКІХ ПАДЗЕЙ

Нарада аб выступленьнях Японіі ў Кітаі.

ТОКІЁ, 26-7. Прэм'ер Танака запрасіў да сябе ангельскага, францускага і італьянскага паслоў і пасла Злучаных Штатаў і вёў размову з імі ў сувязі з апошнімі выступленьнямі Японіі ў Кітаі. Па вестках газэт, у гэтай гутарцы пасол Злучаных Штатаў выказаў сумненьне, ці не зьяўляюцца апошнія выступленьні Японіі ў Манчжурыі ўмешваньнем ва ўнутраныя справы Кітаю.

Мукдэнцы просяць грошай.

ТОКІЁ, 25-7. Учора ў Токіё прыбыў прадстаўнік мукдэнскага ўраду Дао-Ша-Мін з мэтай атрымаць пазыку ў разьмеры 60 мільён. даляраў для ўзброеньня Манчжурыі. Камэнтуючы прыезд мукдэнскага прадстаўніка, «Хоцы» дадумваецца, што Мукдэн зрабуе нашчупваць грунт у Японіі. Калі Дао-Ша-Мін пераканаецца, што Японія мае намер дапамагаць Мукдэну, дык мукдэнскі ўрад, на думцы газэты, ізноў будзе шукаць саюзу з поўднем.

Чан-Кай-шы выехаў з Пекіну.

ПЕКІН, 26-7. Чан-Кай-шы сакрэтна выехаў з Пекіну на поўдзень. Зараз-жа за ім бліжэйшымі днямі з Пекіну выяжджаюць ваенныя лідэры. Частка нанкінскага войска прасоўваецца ўздоўж верхня-мукдэнскае чыгункі, але, як мяркуюць, ня зойдзе за лінію Шанхайгуаня, каб ухіліцца канфлікту з Японіяй.

Нота нанкінскага ўраду да ПАЗШ.

ШАНХАЙ 25-7. Пасол Злучаных Штатаў у Кітаі Макмарэй уручыў міністру замежных спраў нанкінскага ўраду Ван-Чжэн-ціну ноту ад ураду Злучаных Штатаў, у якой заяўляе аб сваёй гатоўнасьці перагляду дагавору між Кітаем і Злучанымі Штатамі. У ноце між іншым гаворыцца: «урад Злучаных Штатаў выказвае гатоўнасьць прыняць у бліжэйшы час перамовы, з мэтай выконваньня новага дагавору між Злучанымі Штатамі і Кітаем, на аснове ўзаемнага прызнаньня прынцыпу нацыянальнай таможаннай аўтаноміі і прынцыпу найбольш спрыяючай дзяржавы».

Скарачэньне амэрыканскіх сіл у Кітаі.

ВАШЫНГТОН, 25-УІІ. Камандаваньне амэрыканскімі ваеннымі і марскімі сіламі ў Кітаі паказала вашынгтонскаму ўраду на патрэбнасьць скарачэньня амэрыканскіх сіл у Кітаі.

У сувязі з гэтым 1.300 салдат марской пяхоты атрымалі загад вярнуцца на бацькаўшчыну. Агульны лік амэрыканскага войска, якое асталося ў Кітаі, складае 2.500 чал. Усе ваенныя караблі пакуль-што застаюцца.

Афганістан і нанкінцы.

ПЕКІН, 25-УІІ. Як паведамляюць, афганскі ўрад прапанаваў нанкінскаму ўраду заключыць гандлёвы дагавор.

ЗАБАСТОЎКА НА ІНДЫЙСКІХ ЧЫГУНКАХ

ЛЁНДАН, 26-7. Паводле паведамленьня газэт, на паўднёва-індыйскай чыгунцы наладжаны такі-сякі рух. Начных паяздоў няма, дняўныя ходзяць з узброенай аховай. Наперадзе гэткага поезда пушчаецца цягнік з паліцэйскімі. У выніку нявопытнасьці штрэйхбрэхераў, часта здараюцца чыгуначныя катастрофы. У Палякарай поезд налящеў на аўтабус, прычым было забіта 10 чалавек. У Мадуры і Палякарай паліцыя страляла ў бастуючых; шмат пакалечана. Арышты кіраўнікоў забастоўкі ня спыняюцца.

Пра дзяржаўную ўласнасьць на зямлю.

(У парадку абмеркаваньня саюзнага зямельнага законапраэкту).

Вельмі важнае пытаньне аб суб'ектах права ўласнасьці на нацыяналізаваную зямлю закрануў т. Ігнатовіч у артыкуле сваім «Да пачатку землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня» («Сав. Бел.» № 169). Аўтар грунтоўна крытыкуе рэдакцыю арт. 1 праэкту, але прапануе зьмяніць яе ў тым сэнсе, што права ўласнасьці на зямлю належыць саюзным рэспублікам, а Саюзу ССР—права распараджэньня зямлёю гэтых рэспублік.

У гэтай прапанове т. І. ідзе далей праэкту. Калі праэкт агульных асноў у пункце «б» арт. 3 дае Саюзу ССР права распараджэньня нязначнай часткай нацыяналізаванай зямлі і пакідае гэтае права за саюзнымі рэспублікамі ў адносінах да ўсёй астатняй зямлі, то т. І. лічыць, што Саюз ССР павінен распараджацца, наогул усімі землямі. Значыць, Саюз па праву распараджэньня будзе здаваць зямлю ў арэнду і пад забудоўку, будзе даваць зямлю ў працоўнае карыстаньне, адбіраць яе ў разе неабходнасьці і адводзіць дзяржаўным і грамадзкім установам для розных патрэб. Што-ж тады застанецца на долю саюзных рэспублік—уласьніц зямлі?

Усе пытаньні, якія ставіць у сваім артыкуле т. І., і шмат другіх, якія выклікаюцца рэдакцыяй арт. І праэкту агульных асноў, ня маглі-б паўстаць, калі-б уласьцівае грамадзянскаму праву паняцьце аб суб'ектах права ўласнасьці ня было-б перанесена ў галіну права сацыяльнага.

Запраўды-ж зямля ў сацыялістычнай дзяржаве ня рэч, не тавар, які мае менавую вартасьць і належыць пэўнай асобе. Зямля складае асноўную прыладу вытворчасьці. Яна належыць сацыялістычнай дзяржаве і служыць у яе руках магутным сродкам для паступовага набліжэньня да сацыялізму. Для дасягненьня гэтай канцовай мэты на дзяржаву ў асобе яе органаў ад саюзных да сельскіх саветаў ускладаюцца адносна да зямлі пэўныя абавязкі. Ажыцьцяўленьне іх забясьпечваецца належнымі правамі. У агульных асновах паказваюцца правы Саюзу ССР і саюзных рэспублік. У зямельных кодэксах павінны быць паказаны правы аўтаномных рэспублік, выканаўчых камітэтаў і саветаў. Пры такой пастаноўцы пытаньня не патрэбен суб'ект права ўласнасьці на нацыялізаваную зямлю.

Суб'ектыўныя правы Саюзу ССР і саюзных рэспублік уласнасьці на зямлю савецкай дзяржавы скажаюць яе сацыялістычную сутнасьць «Зусім бязьзьместнае пытаньне, да каго гэтая ўласнасьць належыць: да Саюзу ССР, саюзных ці аўтаномных рэспублік. У адносіне да дзяржаўнай уласнасьці можна толькі ставіць пытаньне, як гэтая ўласнасьць ажыцьцяўляецца, як разьмяркоўваецца паміж Саюзам і рэспублікамі, якія ўваходзяць у яго склад абавязкі да зямлі, зьвязаныя з выкананьнем яе сацыяльнай мэты».*)

Дзяржаўная ўласнасьць на нацыяналізаваную зямлю бясcуб'ектна. Прынцып гэты ўстаноўлен быў 1 і 2 Усебеларускімі і 9 Усерасейскім Зьездамі Саветаў і праводзіцца цяпер усімі савецкімі Канстытуцыямі і зямельнымі кодэксамі. Паводле іх, «зямля складае ўласнасьць рабоча-сялянскай дзяржавы», а па Канстытуцыі БССР—«сацыялістычнае дзяржавы», без паказаньня пры гэтым канкрэтнай рэспублікі, як уласьніцы зямлі. Карыстаньне зямлёю, згодна нашай Канстытуцыі, вызначаецца асобнымі законамі СССР і БССР у межах іх кампэтэнцыі.

Таму з арт. 1 праэкту агульных асноў землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня трэба выключыць словы: «саюзных рэспублік, прычым права ўласнасьці на зямлю з уваходам гэтых рэспублік у Саюз ССР пераходзіць да апошняга». Выразу гэтага ня было ў папярэдніх праэктах агульных асноў, якія былі разасланы ў саюзныя рэспублікі на заключэньне. Зьмена арт. 1 праэкту зроблена была, як відаць, у апошні момант перад унясеньнем праэкту агульных асноў на разгляд законадаўчых органаў.

Вішнеўскі.

*) Д. Розэмблюм. Агульныя асновы землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня. Штотыднёвік Савецкай Юстыцыі. Масква 1926 г. № 24.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Рабачком не абараняе інтарэсаў рабочых

Смалявічы. 24 ліпеня адбыўся агульны сход рабочых саўхову Смалявічы, дзе выявілася, што рабачком не абараняў інтарэсаў рабочых.

Санітарная камісія зімою абсьледавала ўсе кватэры рабочых, склала акт аб рамонце, але і дагэтуль адміністрацыя нічога не зрабіла, бо рабачком маўчаў.

У кватэрах сырасьць, а ў сенцах Жыгалкі можна ногі паламаць,—такімі пытаньнямі рабачком ня цікавіўся.

Саўхозам яшчэ з восені прададзен увесь хлеб, цяпер рабочыя купляюць у спэкулянтаў па 5-6 руб. пуд (гэта пры 25 руб. пэнсіі): часта прыходзіцца быць і бяз хлеба і гэта ў самую гарачую рабочую пару. Рабочыя вельмі нездаволены і кажуць, што калдагаворы трэба заключаць у чэрвені і ліпені м-цах, калі можна лепей падлічыць і каштоўнасьць рабочай сілы і каштоўнасьць прадуктаў, а ня ў студзені м-цы.

Культпраца кульгала, выпушчан толькі адзін № насьценгазэты; з выпіскаю газэт справа стаіць лепей, выпісваюць усе газэты, але чытаюць кепска. Ваенізацыя не праводзілася.

Кіраўніцтва з боку райкому рабземлесу было слабое.

О. Х.

Цацкаюцца з растратчыкам.

Ворша. У красавіку г. г. Беларускае Кіраўніцтва Сувязі, за нядбайныя адносіны да працы, звольніла загадчыка Круглянскім аддзяленьнем сувязі Казлоўскага.

Пасьля зьвальненьня высьветлілася, што Казлоўскі растраціў 44 руб. сум ашчаднай касы.

Нездаволены Казлоўскі падаў у суд скаргу, каб яго аднавілі на працы.

Ня гледзячы на растрату і іншыя злоўжываньні Казлоўскага, прыехаўшы на суд загад. аршанскай канторы Кратовіч памірыўся з Казлоўскім і перад судом даў згоду, што ён Казлоўскага пераведзе ў Талочын з выдачай 75 руб. пад'ёмных.

Суд гэта ўсё запісаў і справу скасаваў. Казлоўскі паехаў у Талочын.

У Талочыне ён прадаўжаў свае справы. Аднойчы ў яго не хапіла ў касе 100 руб. Праверылі, 20 р. знайшлі.

Праз некалькі дзён у яго ізноў не хапіла ў касе... 160 руб. Ізноў праверылі, ізноў знайшлі толькі 80 руб. Астатнія 80 руб. Казлоўскі растраціў.

Тады загадчык Талочынскім аддз. піша ў акркантору:

... «З Казлоўскага ўзята распіска на 80 р., за нядбайныя адносіны ён зьнят з працы па страхавому аддзелу і адпраўлен... у водпуск»...

Вярнуўся з водпуску растратчык, ізноў узяўся за грашовыя апэрацыі.

Няма ніякае гарантыі, што праз тыдзень яго каса будзе цэла.

Невядома, чаму аршанская кантора цацкаецца з гэткімі „працаўнікамі".

Мік. Міхеяў.

У ПОШУКАХ ПРАЎДЫ.

Дуброўна. Вясной мінулага году сялянін з вёскі Карабанавічы (Аршаншчына) Аўласенкаў Хв. падаў у Дуброўненскую райзямкамісію заяву, у якой кажа, што яго сноха, бедная ўдава Тэкля Аўласенкава, няправільна захапіла ў яго каля 100 кв. аршын пахатнай зямлі.

У заключэньне Аўласенкаў прасіў земкамісію зрабіць абмер зямлі, належачай яму і Тэклі.

Райкамісія тэрмінова камандыравала на месца свайго прадстаўніка.

Сьведкай на час абмеркі Аўласенкаў заклікаў свайго стрэчнага брата.

Тэклю аб гэтым, бязумоўна, не паведамілі.

Раней, чым рабіць абмер, Аўласенкаў «для храбрасьці» пачаставаў камісію самагонкай.

Карыстаючы вясёлы настрой «камісіі», Аўласенкаў паказаў зусім няправільныя межы, у выніку чаго яго заява аказалася сапраўднай.

Даведаўшыся аб „працы" камісіі, Тэкля падала скаргу ў райземкамісію, каб зрабіць сапраўдную абмерку.

Старшыня камісіі, Макасюк, добры сябра Аўласенкава, грозна зірнуўшы на Тэклю, сказаў:

— Нам няма неабходнасьці разглядаць тваю скаргу.

Тэкля пайшла ў РВК, з РВК у райком, з райкому...да Макасюка.

Усе пацiскалі плячамі ды маўчалі. Так цягнулася 1½ месяцы.

Тэкля зьвярнулася ў Негацінскі с.-савет.

Зьдзіўлены старшыня с.-с. і другі сябра пайшлі і праверылі «працу» «камісіі». Аказалася, што Аўласенкаў быў ня праў. Аб гэтым склалі акт.

Тэкля ізноў пайшла ў райземкамісію.

— Гэты акт незаконны. Вашу скаргу мы ня хочам разглядаць,—заявіў Макасюк.

Абыўшы ўсе парогі мясцовых устаноў і не знайшоўшы праўды, Тэкля ў чэрвені месяцы паехала за 26 вёр. у Акрземкамісію, падала скаргу і паказала сваіх сьведак.

У Акрземкамісіі справа разглядалася ў жніўні.

Тут Аўласенкаў заявіў, што ён мае 2 дз. зямлі ў той час, калі ў яго было 7. Аўласенкаву вядома паверылі. Тэклі-ж не далі ўсяго гаварыць, часта грозна крычалі на яе, сьведак не дапрашвалі.

(У гэты час Макасюк быў у Воршы).

Тэкля зноў засталася вінаватай.

Доўга хадзіла і езьдзіла Тэкля па ўстановах раёну і акругі, усё напрасна.

У лютым г. г. яна падала скаргу пракурору, які абяцаў тэрмінова патрабаваць справу з Дуброўны.

Тэкля ўздыхнула свабадней, але рана.

Прыяжджае яна ў сакавіку да пракурора, а ёй кажуць:

— Яшчэ ня прыслалі, пачакай. Езьдзіла 2 разы ў красавіку, 3 разы ў маі, 3 разы ў чэрвені, 2 разы ў ліпені, а ёй усё кажуць:

— Пачакай, скора прыдзе.

У апошні раз дзяўчына, дзелавод пракурора, разлавалася:

— Надаела ты нам, а вось такіх спраў пракурор наогул ня хоча разглядаць.

Хадзіла Тэкля ў жанаддзел, які паслаў яе да райкому, райком некалькі раз абяцаў націснуць на Макасюка, але ўсё гэта дарэмна. Да яго не датычыцца тое, што сялянка-бяднячка з 2 дзяцьмі згубіла больш месяца працоўнага часу, што яна церпіць вялікае гора.

Трэба за гэту абураючую цаганіну, а нават і зьдзекі, вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Мік. С.

Загатоўкі ўзмацняюцца.

Гомель, 27-7. Загатоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў за другія дзесяць дзён ліпеня месяца ўзмацняецца. Усяго загатавана сельска-гаспадарчых прадуктаў на 31712 рублёў і хлебапрадуктаў—22,8 тон.

1500 чал. утаілі аб'екты абкладаньня.

Гомель, 27-7. У акрузе за ўтойваньне вучотаў аб'ектаў абкладаньня прыцягнута да судовае адказнасьці 1500 чалавек.

Інструктаваньне сельсаветаў.

Гомель, 27-7. У зьвязку з пашырэньнем правоў сельсаветаў, прэзыдыум акрвыканкому, у мэтах лепшага абслугоўваньня сельсаветаў, прызнаў неабходным з новага бюджэтнага году ўвесьці ў штат Гомельскага, Веткаўскага, Рэчыцкага райвыканкомаў па адным інструктары для інструктаваньня сельсаветаў.

397 тысяч на дарожнае будаўніцтва.

Гомель, 27-7. У новым бюджэтным годзе намячаецца выдаць 397 тысяч руб. на дарожнае будаўніцтва. З гэтае сумы 302 тысячы руб. будуць выдадзены на акруговыя дарогі і на пабудову Хальчанскага маста, 44 тысячы на раённыя дарогі і 50 тысяч р. на сельскія.

Апрача таго, на палепшаньне сельскіх дарог будзе выкарыстана частка сродкаў з сум па самаабкладаньні.

Эксплёатацыя рабочых.

Ворша, 27-7. У м. Слаўнае на паравым млыне і лесапільным заводзе рабочыя працуюць больш году, а ў саюз ніяк ня змогуць уступіць. Прыватнікі—арандатары іх эксплёатуюць. Райком прафсаюзу ніколі не заглядваў сюды, а пагэтаму і ня ведае аб умовах жыцьця рабочых.

Арганізацыя птушніцкага камбінату.

Жлобін, 27-7. У мэтах палепшаньня якасьці птушак—Белдзяржгандаль наладзіў у Жлобіне птушніцкі камбінат каля возера Вір, дзе будзе праводзіцца канцэнтрацыя птушак (гусі, качкі, куры і інш.) для экспарту заграніцу.

Пры камбінаце таксама будзе наладжана птушкабойня, спэцыяльныя памяшканьні для харчаваньня птушак.

Наладжваньне гэтага камбінату бязумоўна адыграе значную ролю як у адносінах колькасьці, так і якасьці экспарту жывых і бітых гусей, кур і качак.

Вялікі пажар.

Барысаў 27-7. *У вёсцы Сівец Барысаўскага раёну выбухнуў па невядомых прычынах вялікі пажар. Згарэла 14 сялянскіх двароў з усёй маемасьцю. Страты ад пажару дасягаюць 12.000 руб.*

Пачалася выплата пагарэльцам страхавой узнагароды.

„Пешаходы" Цэханоўскі і Датукашвілі.

(Па тэлеф. ад нашага карэспандэнта).

Бабруйск, 26-УІІ. 19-га ліпеня ў Бабруйск зьявіліся на цягніку грамадзяне Цэханоўскі і Датукашвілі (Бурдзінаў), якія, па іх словах, робяць падарожжа навакол сьвету пехатою.

«Пешаходы» заявілі, што іх у падарожжа накіравалі Вышэйшы Савет Фізычнае Культуры і рэдакцыя газэты «Камсамольская Праўда». У Бабруйску яны атрымалі належную таварыскую сустрэчу і грашовую дапамогу рублёў на 50.

Прабыўшы ў Бабруйску тры дні, «пешаходы» цягнікам паехалі ў Менск. З мэтаю выяўленьня сутнасьці гэтага падарожжа і саміх асоб падарожнікаў, тэлеграфна з Бабруйску была запытана рэдакцыя „Камсамольскае Праўды".

Нядаўна атрыман адказ: «Падарожжа нікім не арганізавана, лічым гэта простым брадзяжніцтвам".

Такім чынам, «падарожнікі» Цэханоўскі і Датукашвілі зьяўляюцца нічым іншым, як лоўкімі ашуканцамі.

„БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ" ВСНГ І ДЗЯРЖПЛЯНУ.

(З пасяджэньня Нацкамісіі пры ЦВК БССР).

Беларуская мова для некаторай групы адказных працаўнікоў і спэцыялістаў ВСНГ і Дзяржпляну зьяўляецца прыкрым «иностранным языком».— Для перапіскі з іншымі ўстановамі існуе штатны «беларус», які перакладае ўсе паперкі.

26-га ліпеня на пасяджэньні нацкамісіі ЦВК быў заслухан даклад тав. Брыгневіча аб стане беларусізацыі ў ВСНГ і Дзяржпляне. Больш нядбайных адносін да справы правядзеньня нацпалітыкі ў гэтых установах цяжка знайсьці.

У гэтых установах можна знайсьці працаўнікоў, якія глядзяць на беларускую мову, як на прыкры „иностранны язык", на якой ні гаварыць, ні пісаць нельга, а пра чытаньне беларускіх газэт і гаварыць няма чаго. Ужо ня кажучы аб ужываньні беларускай мовы ў штодзённай працы, але нават тыя рэдкія паперкі, якія пішуцца пабеларуску—няграматныя.

Некаторыя спэцыялісты гавораць адкрыта, што наўрад, ці ўдасца перавыхаваць спэцыялістаў: „Да канца году нейкую дробязь зробім надворна, а ўнутры будзе кепска" (Гольштэйн).

Некаторыя спэцыялісты, каб адкараскацца ад беларусізацыі, пагражаюць, што ўцякуць.

Возьмем спачатку ВСНГ. Загады аб пераходзе апарату на беларускую мову былі аддадзены 15-га лютага і 29-га верасьня 1926 г., 9-га ліпеня 1927 г. і 15-га ліпеня 1928 г.

Прэзыдыум ВСНГ працуе амаль выключна на расейскай мове, 2 члены рабочай часткі прэзыдыуму ня ведаюць беларускай мовы. Усе спэцыялісты, за выключэньнем паасобных выпадкаў, вядуць працу на расейскай мове, а тэхнічныя працаўнікі ім перакладаюць. Спэцыялісты ўзлажылі на плечы тэхнічнага пэрсаналу канцэлярыі такую працу, што тыя нездарма вынесьлі наступную пастанову на агульным сходзе супрацоўнікаў ад 7-га ліпеня г. г. „Спэцыялістам трэба старацца патроху таксама пісаць пабеларуску, не накладаючы гэтае працы на тэхнічных працаўнікоў канцэлярыі".

Наогул у гэтай установе ніхто не зацікаўлен справай беларусізацыі. Існуе пры ячэйцы гурток па вывучэньні беларускай мовы, але яго наведвае 4-5 асоб. На працу запрашаюцца спэцыялісты, якія ня ведаюць беларускай мовы і г. д.

У Дзяржаўнай Плянавай Камісіі на беларускай мове працуюць па дзелаводзтву—сацыяльна-культурная, с-гаспадарчая, бюджэтная і будаўнічая, сакратарыят часткова працуе на беларускай мове, і то толькі нядаўна. На расейскай мове працуюць сэкцыі прамысловая, эканамічная і кан'юнктурнае бюро. На пасяджэньнях сэкцый і прэзыдыуму праца вядзецца на расейскай мове, за выключэньнем культурна-сацыяльнай сэкцыі.

Адносіны спэцыялістаў да беларусізацыі ў большасьці ўстрымана-ўмоўныя. Выпадкаў звароту на яўрэйскай і польскай мове няма. Адміністрацыйных пакараньняў за нежаданьне вывучаць беларускае мовы ня было. Гутарка ўнутры ўстановы, за выключэньнем некаторых асоб, вядзецца парасейску.

Больш увагі шэфскай працы.

Прафсаюзы ня выявілі належнай ініцыятывы па ўцягненьні рабочых і служачых у шэфпрацу.—У большасьці шэфячэйкі не разгарнулі шырокай працы.

У працягу апошняга часу АПА ЦК КП(б)Б сабраны весткі і падагулена становішча шэфскай працы ў БССР. З матар'ялаў відаць, што шэфская праца пастаўлена нездавальняюча амаль ва ўсіх акругах БССР, а ў некаторых мясцовасьцях нават меўся распад шэф'ячэек (Н. Беліца, Залінейны раён, Гомельскай акр.) і інш.

Шэфпрацай мала ахоплена рабочых і служачых.

Гаворачы аб лічбовым складзе шэфарганізацый, трэба адзначыць зусім нявялікі процант рабочых і служачых: ад 7 проц. (Гомель, Бабруйск) і да 24 проц. (Віцебск). А ўсяго па БССР у шэфтаварыствах налічваецца каля 26.000 чал.

Лік камсамольцаў у шэфтаварыствах даходзіць да 21 проц.; а калі ўзяць паасобныя акругі (Бабруйская), то камсамольцаў зусім мала (1-2 пр.).

Гэтыя лічбы сьведчаць, што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў шэфтаварыствы рабочых, служачых і асабліва членаў камсамолу, і гэтым самым палепшыць якасны склад шэфарганізацый. Таксама трэба наладзіць жывую сыстэматычную працу з шэфскім актывам, які, у першую чаргу, павінен быць знаём са ўсімі канкрэтнымі мерапрыёмствамі па працы ў вёсцы. У Віцебску і Воршы ўжо зроблен пачатак сыстэматычнай працы з актывам.

Як працуюць шэф'ячэйкі.

Шэф'ячэек у БССР налічваецца звыш 2000; большасьць з іх існуюць фармальна, абмяжоўваючы сваю працу, галоўным чынам, зборам членскіх узносаў і дапамогай партыі праводзіць палітычныя кампаніі ў вёсцы. Сходы ячэек праводзяцца нерэгулярна: ёсьць такія ячэйкі, дзе сходы не праводзіліся ў працягу цэлага году (Гомель). Сходы праходзяць мімалётам—10-15 хвілін (Віцебск). У некаторых ячэйках няма бюро, а працуе толькі адзін прадстаўнік, вылучаны партыйнай ячэйкай. Выхаваўчая праца амаль не праводзіцца, у выніку чаго члены шэф'ячэек мала знаёмы з задачамі партыі на вёсцы.

Абсьледаваньне па Бабруйскай акрузе паказала, што з 11 ячэек толькі 5 яч. займаліся пытаньнямі арганізацыі гаспадарчай дапамогі вёсцы, а ў Віцебску з 56 ячэек працуюць па пляну толькі 36 ячэек.

Дапамога шэфаў у перабудове вёскі

хоць невялікая, але маюцца вынікі практычнай дапамогі шэфтаварыстваў у культурнай перабудове нашай вёскі. Так, напрыклад, арганізавана т-ваў, арцеляў і паказальных участкаў: менскімі шэфтаварыствамі—60, віцебскімі—9 і аршанскімі—10. Гэта толькі адна галіна працы; ёсьць значныя дасягненьні і ў іншых галінах (кааперыраваньне, шматпольле і г. д.)

Некалькі лічбаў аб культурна-асьветнай дапамозе. Для прыкладу возьмем Менск і Віцебск. Абслугоўваецца хат-чытальняў: Менск—53, Віцебск—9; чырвоных куткоў: Менск—63, Віцебск—62. Акрамя гэтага, шэфтаварыствамі шмат абслугоўваецца палітасьветных і сельска-гаспадарчых гурткоў.

На гэтых лічбах мы спыніцца ня можам; трэба пайсьці па лініі яшчэ большай арганізацыі культурна-асьветнай дапамогі.

Слабы ўдзел у шэфпрацы прафсаюзаў і камсамолу.

Прафсаюзы ў сваёй большасьці лічаць, што шэфская праца іх не датычыцца, ёсьць выпадкі, калі прафарганізацыі ня толькі не дапамагаюць у працы, а нават перашкаджаюць.

Ня лепш справа абстаіць і ў камсамоле. Акрамя гэтага, назіраецца слабая сувязь шэфарганізацый з жаночымі дэлегацкімі сходамі.

Прафсаюзам і камсамолу трэба заняць цэнтральнае месца ў шэфскай працы.

Далейшыя задачы шэфарганізацый.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б, заслухаўшы вынікі становішча шэфскай працы рабочае класы над вёскай, вынес цэлы шэраг канкрэтных дырэктыў.

Перш за ўсё трэба будзе перагледзець склад шэфарганізацый у сэнсе палепшаньня іх сацыяльнага складу, а таксама перагледзець кіруючы склад шэфарганізацый.

У цэнтры ўвагі шэфпрацы павінна стаць рашучае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі па кааперыраваньні і калектывізацыі сельскай гаспадаркі і сталая культасьветная дапамога. Апрача гэтага, трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу на ажыўленьне ўнутрывыхаваўчай працы і масавай працы шэфскіх ячэек, праводзіць рэгулярна сходы, палягшаючы сувязь з вёскай.

Урэшце, партарганізацыям неабходна ўзмацніць жывое сталае кіраўніцтва з шэфскімі арганізацыямі, дабіваючыся вучоту іх работы і рэальнага правядзеньня ў жыцьцё пастаноў і рашэньняў XV зьезду ЎсеКП(б) і 11 зьезду КП(б)Б.

Я. З.

Ф. ЛЕНГНІК.

II ЗЬЕЗД РСДРП, ЯК КАЛЫСКА БАЛЬШАВІЗМУ

II-гі зьезд РСДРП складае найбольш важную эпоху ў гісторыі нашае партыі, і таму зусім зразумелы намер нашае партыі адзначыць дваццаціпяцігодзьдзе гэтага гістарычнага зьезду, а таксама і падрыхтоўчы перыяд яго, які супадае з арганізацыяй т. Ленінам «Іскры» ў канцы 1900 і пачатку 1901 году.

Нельга без хваляваньня чытаць цяпер гарачыя старонкі гэтага лепшага помніка палітычнае літаратуры (я маю на ўвазе „Іскру", якая выдадзена цяпер асобнымі кніжкамі), з дэвізам—„З іскры разгарыцца полымя". У газэце мы знаходзім нязвычайныя па сваёй моцы і трапнасьці палітыка-выкрываючыя артыкулы, артыкулы праграмнага характару, якія бліщчаць глыбінёю і хараством выкладаньня зусім выключнай, карэспандэнцыямі, напісанымі і прарэдагаванымі ўмелаю рукою Уладзімера Ільліча. Няма лепшае гісторыі эпохі падрыхтоўкі II-га зьезду, як бліскучыя старонкі гэтага вялічэзнага па сваёй натхнёнай моцы помніка палітыка-асьветнае і палітыка-выкрываючае літаратуры. З кожнага артыкулу і ад кожнага нумару вее на вас вялікай душой яе галоўнага рэдактара—нашага мілага, дарагога, незамянімага Ільліча. Чытайце гэтыя вялікія радочкі, і вам зробіцца ясна, чаму ад такой іскры не магло не разгарэцца яскравае полымя Кастрычнікавае рэвалюцыі, полымя, якое апаліла гарачым дыханьнем усе краіны, увесь сьвет. І вы зразумееце, што спыніць гэты пажар ужо ні што ня можа, апрача канчатковае перамогі рабочае клясы ва ўсім сьвеце.

У пачатку дваццатага стагодзьдзя Расея перажывала прамысловую дэпрэсію, што не магло не адбіцца і на рабочым руху тагочаснае Расеі. Пасьля яскравага выбуху рабочага руху ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя, ужо ў канцы 90-тых гадоў, пасьля арышту большасьці працаўнікоў „Саюзаў барацьбы за вызваленьне рабочае клясы", у галоўных гарадох царскае Расеі пачаў намячацца паварот у бок паслабленьня палітычнае барацьбы. Новыя дзеячы рабочага руху выкінулі сьцяг з новым лёзунгам: „Рабочая Мысль"—у Пецярбурзе і „Рабочее Дело" заграніцаю—палітычныя органы таго часу выказвалі думку, што рабочы рух павінен абмяжоўвацца, галоўным чынам, эканамічнай барацьбой рабочых за палепшаньне іх матар'яльнага становішча, а прыхільнікі буржуазных тэндэнцый з гатоўнасьцю дадавалі, што палітычная барацьба павінна быць справаю буржуазных партый. Група „Освобождение Труда" у асобе Плеханава, Аксельрода, Засуліч і група Ільліча ў далёкай Сібіры выступілі востра проці гэтых новых лёзунгаў. Група Плеханава востра парвала з заграпічным «Союзом русских социал-демократов", а Уладзімер Ільліч з групаю ў сямнаццаць чалавек у Сібіры выцягнуў на сьвет вядомае „Крэдо" (сымбаль веры) Кусковай і Пракаповіча, дзе гэтыя буржуазныя тэндэнцыі выяўляліся асабліва яскрава, і горача апратэставаў яго, што знайшло гарачы водгук і заграніцаю і ўнутры краіны. Вось калі ў Уладзімера Ільліча канчаткова сфармавалася думка, што неабходна, чаго-б гэта ні каштавала, утварыць моцны орган партыі, які павінен выпрацаваць праграму партыі і сабраць у адно раскіданыя часткі партыі. Царскае самаўладзтва лютавала ва ўсю. Арышты, высылкі, зачыненьне газэт і часопісаў, правакатары, зубатаўшчына—усё пускалася ў ход, каб пагасіць выбухнуўшы яскравым полымем рабочы рух. Гэта яшчэ больш дапамагала разьвіцьцю „саматужніцтва". Кожны буйны камітэт стараўся мець свой друкаваны орган, а з тае прычыны, што вопытных рэдактароў і супрацоўнікаў ня было, то органы былі слабыя, нявытрыманыя і выпадковыя па напрамку. І вось зараз-жа пасьля высылкі Уладзімер Ільліч узяўся за ўтварэньне моцнага палітычнага органу, які і павінен быў ня толькі стварыць газэту і літаратуру для рабочага руху, але і быць цэнтрам, зьбіраючым партыю...

Заграніцаю злучыліся дзеячы групы „Освобождение Труда" з групаю Ільліча, а ўнутры краіны, галоўным чынам, аднадумцы Ільліча, і ўтварылі групу „Іскра", якія прыняліся за працу з шалёнай энэргіяй. Трэба было ня толькі напісаць, але і надрукаваць літаратуру і правесьці яе кантрабандным шляхам праз царскую граніцу ці надрукаваць нанова ў тайных друкарнях і распаўсюдзіць яе па ўсіх гарадох, ня гледзячы на пануючы тэрор і правакацыю. Адначасова трэба было ўплываць на камітэт партыі, прымушаючы яго далучыцца да лініі „Іскры", прызнаючы яе сваім органам. Ужо праз год аказалася магчымым стварыць арганізацыйны камітэт па склікаваньні II-га зьезду партыі. І-шы зьезд, які быў у 1898 годзе, ня даў ні якіх вынікаў, бо ўсе ўдзельнікі яго, апрача аднаго, С. І. Радчэнка, былі неадкладна арыштаваны. Галоўным касьцяком арганізацыйнага камітэту былі члены арганізацыі «Іскра». Яны сядзелі і разьяжджалі па розных гарадох і фактычна стваралі тую партыю, якую павінен быў легалізаваць зьезд. Да моманту II-га зьезду касьцяк партыі фактычна ўжо быў створан. Былі сабраны людзі арганізацыі, быў наладжан транспарт, тайныя друкарні, існавала арганізацыя «агентаў» арганізацыйнага камітэту, якая складалася з «прафэсыянальных рэвалюцыянэраў», якія займаліся, як спэцыяльнасьцю, рэвалюцыйнаю працаю.

Што-ж служыла зьместам працы гэтых першых заснавальнікаў партыйнага цэнтру? Цяжка ў некалькіх словах ахарактарызаваць гэтую працу, але я ўсё-ж паспрабую гэта зрабіць. Чыста практычная праца іх ясна ўжо з папярэдняга: утварэньне сэкратарыяту тут і заграніцаю, прычым лісты пісаліся часта шыфрам, што было вельмі цяжкай і маруднай працай; кожны «агент», у сваю чаргу, павінен быў пісаць і ў расейскі і ў заграічны цэнтр магчыма часьцей і дакладней. Далей—утварэньне транспартнай арганізацыі як заграніцаю, так і ўнутры краіны. Атрыманьне літаратуры было адной з галоўных умоў правільнае арыентыраванасьці працы данага партыйнага камітэту: нумары «Іскры», ленінская брашура «Что делать» былі вельмі каштоўным матар'ялам і расцэньваліся на золата, а „Майскі лісток"—адзіны для ўсяе партыі—меў вялізнае значэньне ня толькі як сымбаль партыі, але стварэў аўтарытэт у вачох рабочых данаму органу і меў таму рашаючае ня толькі практычнае, але і прынцыповае значэньне.

Потым неабходна было-б падрабязна азнаёміцца з унутранай працай данага камітэту, змагацца з адзнакамі апартунізму, саматужніцтва, падтрымліваць бадзёрасьць і баявы дух і, нарэшце, растлумачваць розныя пытаньні, непаразуменьні. Апартунізм быў тады зьявішчам міжнародным. Бэрнштэйн і Польмар—у Нямеччыне, Жорэс, Мільеран—у Францыі, Струвэ, Туган-Бараноўскі, Бердзяеў, Булгакоў, а таксама Махноўцаў, Тахтароў і шмат іншых—у Расеі атручвалі партыйную думку, і часта патрэбна было ўжываньне самых рашучых мер для зьнішчэньня і растлумачэньня тае блытаніны, якая атрымлівалася ў выніку працы гэтых рэнэгатаў рэвалюцыйнае думкі. Я ўжо не кажу аб тым шуме, які выклікалі іншы раз вельмі вострыя артыкулы «Іскры» па адрасу шумеўшых тады эсэраў, народнікаў і лібэралаў розных толкаў і напрамкаў. «Іскру» часта абвінавачвалі ў вострасьці і нетактычнасьці, і трэба было растлумачваць, што ідэйнае размежаваньне часта немагчыма бяз вострага палемічнага артыкулу, ці грознае сатыры. Калі Струвэ, Туган-Бараноўскі, Бердзяеў, Булгакоў і інш. пад сьцягам марксызму праводзілі бэрнштэйніянства горшае якасьці, ці «Рабочее Дело» і „Рабочая Мысль" баранілі свае вядомыя тэзісы аб стыхійнасьці рабочага руху і неабходнасьці абмежавацца эканамічнай барацьбой, дык нельга было вымагаць асаблівае карэктнасьці ад працаўнікоў «Іскры» супроцьстаўляючых гэтай блытаніне, прыводзячай да апартунізму, да трэд'юніёнізму і «хвасьцізму» выразную тэорыю рэвалюцыйнага марксызму, які імкнуўся ўнесьці планавасьць і сьвядомасьць у стыхійны масавы рух пралетарыяту. У гэтай барацьбе вельмі часта чуліся грубыя словы і слаўвечкі, якія выклікалі пратэсты абурэньня, але высьнялі пазіцыі і ганьбілі супраціўніка. Вось у якіх абставінах склікаўся другі зьезд РСДРП.

СКАРЫСТАНЬНЕ СРОДКАЎ ПА САМААБКЛАДАНЬНІ

У Станькаўскім і Дабрынеўскім с.-с. самаабкладаньне праведзена па ўсіх вёсках. Сродкі самаабкладаньня зараз-жа пачалі скарыстоўвацца. У вёсцы Ланцэвічы будуецца новая школа, у вёсцы Дабрынёва пабудован фэльчарскі пункт—вялікі і прыгожы новы будынак. Рамантуюцца масты і дарогі; у вёсак Коскі і Бярэжжа зроблены грэблі і мост.

Усё гэта робіцца досыць акуратна і вынікі самаабкладаньня выклікаюць задавальненьне з боку сялян.

— Нашы грошы і наша праца,—кажуць сяляне,—ідуць нам на карысьць. У далейшым будзем даваць з большаю ахвотаю.

У іншых сельсаветах, напрыклад, Стайкаўскі самаабкладаньне хоць і праведзена, але сродкі не скарыстоўваюцца. Даводзіцца чуць скаргі сялян:

— Грошы пабралі, а мастоў, грэбель усёроўна няма.

— Купілі сабе гармошку на нашы грошы і ўстрайваюць танцулькі.

Можа гэтыя скаргі і дарэмныя, беспадстаўныя, але скаргі ёсьць, скаргі, якія сьведчаць аб хваравітасьцях у справе рэалізацыі сродкаў самаабкладаньня. Скаргі даводзіцца чуць не ў адным Стайкаўскім с.-с.

Даводзіцца чуць і пажаданьні, галоўнейшыя з іх вось якія: Неабходна болей выклікаць актыўнасьці і ініцыятывы з боку беднаты; ужо да збору сродкаў с-савету неабходна на сходах вёскі намеціць, што трэба зрабіць на сродкі самаабкладаньня, выклікаўшы актыўнасьць саміх сялян; сродкі трэба расходаваць па пляну сельсавету, зацьверджанаму пленумам, а не стыхійна; каб сялянам лепей было відна карысьць ад самаабкладаньня, неабходна расходаваць сродкі ў першую чаргу на вялікія і ўсім зразумелыя патрэбы—масты, грэблі, дарогі, школы, мэдпункты, вэтпункты, а ня пускаць на дробязі, як гармошка, грамафон, плякаты і нават кіно, ня гледзячы на тое, што гэтыя дробязі таксама патрэбны; неабходна праводзіць жорсткі рэжым эканоміі, выконваючы пачатую працу чым найлепей і даводзячы яе да канца. На пленумах сельсавету і агульных сходах вёсак неабходна рабіць падрабязную справаздачу а расходаваньні сродкаў самаабкладаньня

А. З.

Койданаўскі раён.

Барацьба з бяспрытульнасьцю дзяцей.

У ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОВАХ ВЫХОЎВАЕЦЦА 6.000 БЯСПРЫТУЛЬНЫХ.

Патрэбна была вялікая натуга з боку савецкай улады і савецкай грамадзкасьці, каб вылавіць з вуліц усю вялікую плойму будучых жабракоў, зладзеяў, прастытутак і прывучыць іх да здаровай працы, выхаваць, а часам і перавыхаваць і вырваць карані праступнасьці і разьбэшчанасьці.

У БССР гэта праца праводзіцца па лініі Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі, Наркамасьветы і Наркам Аховы Здароўя. У дзіцячых дамох і іншых дзіцячых інстытуцыях зараз знаходзіцца каля 6.000 бяспрытульных дзяцей. Апроч гэтага, існуе цэлы шэраг сталовак, клюбаў, майстэрняў, ясьляў, пляцовак (усяго 84 дзіцячыя ўстановы у якіх і ўтрымоўваюцца гэтыя 6.000 дзяцей).

У 1926-27 г. па лініі Наркамасьветы на справу дзіцячай бяспрытульнасьці было асыгнавана 1.472 тысячы руб., а па лініі Цэнтральнай і акруговых дзіцячых камісій—511.832 руб., а сёлета Цэнтральная Камісія вызначыла па каштарысу 300 тысяч руб., акруговыя камісіі і т-ва «Прыхільнікаў дзяцей» — 375 тысяч руб., што ў адносінах да выдаткаў на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю па дзяржаўнаму каштарысу складае 35 проц.

Апрача дзіцячых дамоў, у веданьні Наркамасьветы знаходзіцца Інстытут Сацыяльнага перавыхаваньня ў Крынках, куды пасылаюць выключна маральна сапсаваных бяспрытульных.

На сродкі Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі будуецца Ўсебеларуская Дзіцячая Калёнія каля Магілеву на 200 дзяцей, на пабудову якой па каштарысу вызначана 121 тысяча руб. Пры калёніі арганізаваны майстэрні — сьлясарная, сталярня, кравецкая, шавецкая, сельская гаспадарка на 125 гэкт. пахаты і 21 гэкт. саду; калёнія мае 60 кароў, 20 коняй, добра арганізаваную малочную гаспадарку, арганізавала пладовы гадавальнік, хмялёвую плянтацыю на 4 гэкт. Зараз пры калёніі будуецца 7-мігодка, праводзіцца вадаправод.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія выдае шмат сродкаў на падтрыманьне розных дзіцячых устаноў і на арганізацыю сталоўкі ў Менску—21 тысяча руб., на адбудову дзіцячай камуны імя Крупскай у Віцебску—10 тысяч руб., на ўтрыманьне дыягностычнага габінэту па вывучэньню бяспрытульных дзяцей—2500 руб., дапамога акруговым дзіцячым камісіям—14 тысяч р., на палепшаньне сталаваньня ў дзіцячых дамох—20 тысяч руб., на стыпэндыі б. выхаванцам дзіцячых дамоў, якія паступаюць у ВНУ, тэхнікумы і прафшколы—6000 руб. і іншыя выдаткі на ўтрыманьне ясьляў, пляцовак для дзяцей батрачак і г. д.

У кожным горадзе БССР знаходзіцца па некалькі ўстаноў для бяспрытульных дзяцей, якія знаходзяцца ў веданьні акруговых дзіцячых камісій. У Менску знаходзяцца ясьлі на 120 ложак, дзіцячы прытулак на 40 дзяцей, 3 пляцоўкі і адчыняецца шавецкая майстэрня.

У Гомелі—дзіцячая калёнія на 160 дзяцей, пераплётна-шавецкая майстэрня на 60 чалавек, сьлясарна-кавальская—на 30 чал., дзіцячы прыёмнік на 40 чал. і клюб-сталоўка—на 40 чалавек.

У Магілеве знаходзіцца клюб-сталоўка на 120 чал., інтэрнат для падросткаў-броні на 20 чал. і 2 дзіцячыя пляцоўкі.

У Воршы знаходзіцца прыёмнік і майстэрня, у Віцебску—трыкатажная майстэрня, дзіцячая камуна, сталоўка, ясьлі і хутка адчыняецца прыемнік; у Полацку—1 прыёмнік і 1 шавецка-рымарская майстэрня. У Бабруйску на сродкі цэнтральнай камісіі субсыдуюцца 9 майстэрняў.

Апроч гэтага, па лініі Наркамасьветы выдаецца 14.900 руб. на 170 дзяцей, якія выхоўваюцца ў прыватных сем'ях (патранат) і 7320 руб. па лініі Нар. Кам. Аховы Здароўя.

ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ Ў БАРАЦЬБЕ З БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ.

Наша далейшая задача—гэта ўзмацніць справу барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю. Ня гледзячы на тое, што разьмеры дзіцячай бяспрытульнасьці зараз значна скараціліся, усё-ж-такі плоймы бяспрытульных дзяцей па вуліцах нашых гарадоў зьяўляюцца рэзкім кантрастам на фоне ўзросшага гаспадарчага і культурнага стану краіны. У сувязі з гэтым ЦК УсеКП пастанавіў дабіцца ліквідацыі ў працягу бліжэйшага году вулічнай бяспрытульнасьці і наогул палепшаньня справы выхаваньня і ўтрыманьня бяспрытульных дзяцей.

Вакол пытаньня рашучай барацьбы з бяспрытульнасьцю дзяцей трэба разварушыць думку савецкае грамадзкасьці. У гэтай справе павінны адыграць вялікую ролю ячэйкі т-ва «Прыхільніка дзяцей», якіх зараз у БССР налічваецца да 300, з 18 тысяч сябрамі. „Тыдзень" дапамогі бяспрытульным дзецям, які распачынаецца 15 жніўня, павінен прайсьці пад лёзунгам ажыўленьня работы ў гэтым кірунку і ўцягненьні ў справу барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю шырокіх працоўных мас да канкрэтнай работы ў гэтай галіне. У часе «тыдню» трэба правесьці вярбоўку новых членаў т-ва „Прыхільнік дзяцей" і арганізаваць новыя ячэйкі.

ЧЫГУНАЧНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАТУРАЕ БЯСПРЫТУЛЬНЫМ — «ЗАЙЦАМ».

І, урэшце, трэба спыніцца на адным прыкрым зьявішчы з боку нашай чыгуначнай адміністрацыі. Ёсьць пэўная катэгорыя бяспрытульных, якая абрала сабе заняткам пэрыядычнае вандраваньне з аднаго месца ў другое. Бяспрытульнага толькі што адзелі, абулі, далі работу ці накіравалі ў дзіцячую ўстанову, а ён усё гэта кідае і драла ў іншае месца. Ужо, не гаворачы пра матар'яльную шкоду (утрыманьне бяспрытульнага каштуе ў год 220 руб.), але зрываецца ўся праца ў сыстэме яго перавыхаваньня.

І што-ж аказваецца, наша чыгуначная адміністрацыя, ня гледзячы на суровыя загады, глядзіць скрозь пальцы на бяспрытульных «зайцаў». Такое патураньне з боку чыгуначнікаў мы лічым ня толькі нядбайнасьцю, але праступленьнем.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з падобнымі сантымэнтамі, бо ў адваротным выпадку мы ніколі не пазбавімся бяспрытульнасьці.

САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ІНВАЛІДАЎ ПАЛЯПШАЕЦЦА.

(Гутарка з Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі тав. Б. Калінiным).

У першыя гады існаваньня БССР, калі нам прыходзілася адбудоўваць нашу разбураную гаспадарку, справа сацыяльнага забясьпечаньня стаяла на нізкім узроўні. У 1923-24 г. атрымоўвалі пэнсію 825 чалавек інвалідаў грамадзянскай і імпэрыялістычнай вайны, у 1927-28 г. атрымліваюць пэнсію 3589 чалавек (усяго на вучоце зараз знаходзіцца 6750 чалавек); рэшта атрымліваюць розныя палёгкі па с.-г. падатку, бясплатныя патэнты і інш. Стаўка пэнсіі за апошнія гады значна павялічылася, складаючы зараз 131 руб. у сярэднім у год. Зусім слушна, што такая дапамога ва ўмовах вёскі адыгрывае вялікую ролю.

Апрача гэтага, каб палепшыць матар'яльнае становішча інвалідаў, яны ўцягваюцца ў розныя віды кааперацыі інвалідаў, у вытворчыя прадпрыёмствы, як майстэрні—шавецкія, кравецкія, хлебапякарні, каўбасная і макаронная фабрыка, мылаварны завод і інш.

Апрача інвалідаў вайны, атрымліваюць таксама пэнсію сем'і загінуўшых у часе вайны, якія з 644 у 1924-25 г. павялічыліся да 4381 у 1927-28 г.

Народны Камісарыят Сацыяльнай Забясьпекі выдае таксама дапамогу сем'ям чырвонаармейцаў. У 1923-24 г. атрымоўвала дапамогу 436 сем'яў, зараз—900. Пэнсія іх павялічылася на 100 проц.

Асобай катэгорыяй зьяўляюцца пэрсанальныя пэнсіянэры, лік якіх з 66 у 1924-25 г. узрос да 232 у сёлетнім г.

Тыя інваліды, якія зусім ня могуць працаваць, зьмяшчаюцца ў інвалідныя дамы. Такіх дамоў у БССР 19 і ў іх знаходзіцца 860 чал. (у тым ліку 118 інвалідаў вайны).

Значная праца праводзіцца ў галіне забесьпячэньня інвалідаў бясплатнымі пратэзамі. Штогод мы выдаём па 350 пратэзаў, і мяркуем да 1933 г. забясьпечыць пратэзамі ўсіх інвалідаў.

Апрача матар'яльнага палепшаньня стану інвалідаў, мы імкнёмся перакваліфікаваць іх у нашых майстэрнях і прадпрыёмствах, дзе яны навучаюцца пэўнаму рамяству. Штогод мы пасылаем пэўны кантынгент інвалідаў у рабфакі і ВНУ. Сёлета мы камандыруем у рабфакі 6 чал.

Не застаюцца інваліды і бяз лекавай дапамогі: штогод мы пасылаем інвалідаў на лепшыя курорты Савецкага Саюзу. Сёлета мы накіравалі на курорт 40 чал.

Чырвоныя партызаны, якія ў свой час адыгралі вялікую ролю ў справе вызваленьня Беларусі, таксама не застаюцца забытымі. У сучасны момант мы выдаём пэнсію 44 партызанам і 34 сем'ям загінуўшых партызанаў. Апроч гэтага, 152 партызаны атрымалі часовую дапамогу, шмат партызанаў і сем'яў загінуўшых партызанаў атрымалі розную іншую дапамогу.

Урэшце трэба сказаць, што аднача-сова з нашым гаспадарчым уздымам, мы паляпшаем сацыяльную забясьпеку. Савецкая ўлада не забывае сваіх гэрояў.

Да ўвагі менскай страхкасы.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ быў заслухан даклад аб фінансавым становішчы Менакрстрахкасы. Сьцьверджан факт цяжкага матар'яльнага становішча страхкасы і пастаноўлена ўжыць захады да палепшаньня фінансаў касы. Будзе праведзен кантроль зарплаты, атрымліваемы кожным застрахаваным. Колькасьць візытаў кантрольных дактароў да хворых будзе павялічан. Дактарам прапанавана таксама высьвеціць прычыны частых занядужаньняў сярод застрахаваных.

Вось асноўныя моманты дакладу. Не адхіляючы вядомага значэньня карыснасьці вышэйпададзеных мер, трэба прызнаць, што ў дзейнасьці страхкасы маюцца яшчэ дэфэкты іншага характару.

Галоўны дэфэкт страхкасы ў тым, што ў яе няма агентаў актыўных, якія могуць выяўляць, хто ў яе сапраўдны і хто фальшывы пэнсіянэр, атрымліваючы дапамогу ў працягу некалькіх месяцаў іншы раз проста па непаразуменьню. Страхкасе трэба выяўляць тыя мёртвыя душы, якія зьяўляюцца цяжкім грузам для яе фінансаў.

Падам некалькі прыкладаў:

У апошнія месяцы, з прычыны стабілізаванага беспрацоўя, асабліва сярод савецкіх і гандлёвых служачых, некаторыя прафсаюзьнікі перайшлі ў розныя саматужныя арцелі і зрабіліся саматужнікамі. Там яны ўжо некалькі месяцаў атрымліваюць сваю долю ад заработку арцелі і ўсё-ж-такі ня спыняюць атрымліваць дапамогу з страхкасы.

Чаму? Таму, што страхкаса—гэта казённая дойная карова і ня грэх падаіць яе, як мага больш—вось погляд некаторых людзей, якіх ужо даўно трэба зьнішчыць.

Хто ня ведае, што ў Менску ёсьць цэлая сярыя жонак рабочых, мужы якіх штомесячна зарабляюць па 100, 120 і больш руб., а жонкі іх атрымліваць з страхкасы дапамогу на падставе таго, што яны недзе працавалі тры-чатыры месяцы і сталі членамі саюзу.

Пры гэтым некаторым жонкам удаецца зарэгістравацца ў дамавой кніжцы пад сваім дзявочым прозьвішчам, ці прозьвішчам памершага мужа, хоць жывуць у адной кватэры з сваімі сапраўднымі мужамі і маюць з імі агульных дзяцей. І гэта ўсё робіцца для таго каб мець магчымасьць ухіліцца ад кантролю страхкасы.

Гэта ўжо даўно агульнавядомы факт і аб гэтым усе ведаюць.

І таму здараецца вельмі часта, што адмаўляюць у дапамозе таму, хто сапраўды ў ёй адчувае патрэбу.

Вывад: страхкаса павінна мець кадр агентаў абсьледавацеляў, людзей чулых і добрасумленных і толькі тады можна спадзявацца, што груз мёртвых душ ня будзе цяжарам для яе фінансаў.

Інвалід Маслоўскі і быхаўская страхкаса.

... Васіль Нічыпаравіч Маслоўскі—72 год ад нараджэньня—інвалід 2-ой катэгорыі, гэрой працы яшчэ 1922-га году.

У красавіку месяцы зьвярнуўся неяк Маслоўскі ў страхкасу быхаўскую.

— Так і так, маўляў, жонка на маім утрыманьні (66 год ёй) і дзевяцёхгадовая ўнучка... Данамажэце... Пэнсію-б мне... Хоць колькі-небудзь...

А быхаўская страхкаса яму:

— «Денег нет, товарищ... Уж как-нибудь в другой раз подойдите»...

З вялікімі цяжкасьцямі ўдалося старому паступіць на працу ў шклозавод «Ільліч». (Гэта—у 72 гады!).

Зарабіў крыху, а тады, у маі, зноў да страхкасы:

— Няма моцы мне... Які з мяне працаўнік?... Самі бачыце... Як-жа з пэнсіяй?!. Няўжо...

— Что-ж вы хотите, товарищ? Денег нет у нас... Работайте на здоровье!.. Мы тут причем?

Так нічога пакутнік і не дастукаўся...

Ю-іч.

Пра вярбоўку ў вайсковыя школы.

Да гэтага часу з боку Цэнтральнай Вярбовачнай Камісіі неаднаразова звярачвалася ўвага акруговых вярбовачных камісій на неабходнасьць як мага скарэй разгарнуць працу па падрыхтоўцы рабочай моладзі ў вайсковыя школы. Часу да прыёму ў школы засталося ня многа, між тым тэмп падрыхтоўчай працы нездавальняючы запатрабаваньням.

Галоўная задача Беларускай Цэнтральнай Вярбовачнай Камісіі, разам з акруговымі вярбовачнымі камісіямі, заключаецца ў тым, каб укамплектаваць належнай колькасьцю кандыдатаў Беларускую Вайсковую Школу імя ЦВК БССР. Туды патрэбна падрыхтаваць і накіраваць пераважна моладзь беларускай нацыянальнасьці, але аднача-сова і моладзь іншых нацыянальнасьцяй. Ад кандыдатаў, якія рыхтуюцца ў Беларускую Вайсковую Школу, патрабуюцца веды па ўсіх дысцыплінах згодна праграм для вайсковых школ наогул. Апроч таго, пры адборцы кандыдатаў неабходна падлічваць, што навучаньне ў школе вядзецца на беларускай мове; вось чаму для беларускага насельніцтва неабходна і абавязкова, а для іншых нацыянальнасьцяй пажадана веданьне беларускай мовы.

Цэнтральная Вярбовачная Камісія пры Прэзыдыуме ЦВК своечасова выпукляла пытаньне аб павялічэньні рабочага складу моладзі, якая накіроўваецца ў вайсковыя школы, абавязкова да 50 проц. Навакол выкананьня гэтай дырэктывы і пабудовы ўсёй працы па прыёму кандыдатаў у вайсковыя школы вярбовачным камісіям неабходна згуртаваць увагу ўсёй грамадзкасьці. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы, як асноўнай, павінна чырвонай стужкай праходзіць праз усе этапы працы па падборы і падрыхтоўцы моладзі ў вайсковыя школы (мэдычныя, экзамэнацыйныя і адборачныя камісіі).

Сёлета мы будзем мець магчымасьць накіраваць жадаючых як у беларускую школу, так і ў вайсковыя школы, якія знаходзяцца ў іншых саюзных рэспубліках: пяхотныя, артылерыйскія, кавалерыйскія і спэцыяльныя.

Дзеля больш пасьпяховага выкананьня ўсіх задач, зьвязаных з вярбоўкай і камплектаваньнем школ, неабходна прыцягнуць да гэтай справы шырокія колы савецкай грамадзкасьці. ЛКСМ, прафсаюзы, ТДА-Авіяхім, установы асьветы—вось тыя арганізацыі, якія, галоўным чынам, павінны дапамагчы вярбовачным камісіям у выкананьні ўскладзеных на іх задач.

Астатак досыць абмежаванага часу павінен быць скарыстан ня толькі для механічнага адбору кандыдатаў, а і для пашырэньня і арганізацыі падрыхтоўчых заняткаў.

А. Сташэўскі.

ПАЧЫНАЕЦЦА ПАБУДОВА ТРАМВАЮ.

Пленум гарсавету пастанавіў весьці пабудову гаспадарчым спосабам.—Ужо запрошаны кіраўнікі будаўніцтва.—Матар'яламі будаўніцтва забясьпечана.—Сёлета будзе скончана пракладка лініі МББ—Камароўка.

Будаўніцтва будзе весьціся гаспадарчым спосабам.

Адным з важных пытаньняў пабудовы трамваю зьяўлялася — весьці будаўніцтва гаспадарчым спосабам, ці здаць яго з падраду.

Гэтае пытаньне ў свой час было пастаўлена на вырашэньне пашыранага пленуму Менскага гарадзкога савету, але рашэньне ня было вынесена і было даручана прэзыдыуму гарсавету прапрацаваць пытаньне дадаткова.

На пленуме гарсавету 26 ліпеня прэзыдыум унёс прапанову весьці будаўніцтва гаспадарчым спосаба і пленум гэту прапанову аднагалосна зацьвердзіў.

Якія выгады дасьць пабудова гаспадарчым спосабам?

Пры гаспадарчым спосабе будаўніцтва трамваю будзе гарантыя за лепшую якасьць выкананьня работ, бо гэтыя работы будуць праводзіцца тымі, хто ў далейшым будзе эксплёатаваць трамвай і, зразумела, яны будуць зацікаўлены ў лепшай якасьці будаўніцтва, бо за кепскую работу прыйдзецца несьці адказнасьць. Між тым пры падрадным спосабе будаўнічая арганізацыя пасьля здачы работ не нясе адказнасьці за доўгагадовую службу пабудовы.

Разам з тым будаўніцтва гаспадарчым спосабам, пры добрай арганізацыі гэтых работ, абыйдзецца таньней (па арыентыровачных падліках на 10 проц.) Калі здаць пабудову трамваю з падраду, дык гарсавету неабходна мець свой тэхнічны нагляд, які трэба праводзіць у працэсе самога будаўніцтва. Для гэтага нагляду трэба было-б мець ня менш 2-3 высокакваліфікаваных працаўнікоў, якія маглі-б кантраляваць вытворчасьць будаўнічых работ. Гэты апарат трэба было-б, зразумела, і аплачваць. Між тым, калі да гэтага апарату дадаць яшчэ 2-3 адзінкі—ён ужо зможа сам весьці будаўніцтва. Тут трэба яшчэ дадаць, што апарат такі ўсё роўна будзе патрэбен пры эксплёатацыі трамваю: прыйдзецца весьці рамонт, пашырыць трамвайны рух і г. д., наогул кіраваць эксплёатацыяй.

Будаўніцтва трамваю з падраду можна было-б перадаць маскоўскай арганізацыі, якая ў калькуляцыю ўключае вядомы процант на ўтрыманьне цэнтральнага апарату, а пры гаспадарчым спосабе гэты накладны расход адпадае. Калькуляцыя работ пры падрадным спосабе ўдаражаецца таксама шэрагам паездак з Масквы прадстаўнікоў будаўнічай арганізацыі для кіраўніцтва і апрача таго адпаведнымі падаткамі, якімі гарсавет не абкладаецца.

Трэба таксама мець на ўвазе і тое, што ў сувязі з пракладкай трамвайнай сеці, прыйдзецца праводзіць шэраг дадатковых работ: урэгуляваньне пытаньняў па пераносцы тэлеграфных і тэлефонных ліній, вадаправодных магістраляй і г. д. З падрадчыкам гэтыя пытаньні рэгуляваць будзе вельмі цяжка, бо ён у гэтых пытаньнях не зацікаўлены, абы толькі весьці сваю работу, а таму ў працэсе будаўніцтва могуць сустрэцца тыя ці іншыя перашкоды, якія будуць не на карысьць гарсавету.

Калі-ж будаўніцтва будзе весьціся гаспадарчым спосабам, дык гарсавату ўсе гэтыя пытаньні будзе лёгка ўрэгуляваць.

Шляхам перагавораў у Маскве высьветлілася, што ўдасца арганізаваць досыць кваліфікаваны апарат для кіраўніцтва работамі па пабудове трамваю.

Менскі гарсавет улічыў усе вышэйпаказаныя акалічнасьці і таму вырашыў будаўніцтва весьці гаспадарчым спосабам

Вырашана заказаць шырокія вагоны.

Другім пытаньнем, якое прышлося гарсавету ўсебакова абмеркаваць, было пытаньне аб шырыні трамвайных вагонаў.

У Савецкім Саюзе трамвайныя вагоны бываюць шырынёй у 2230 міліметраў і 2400 м-м. Кошт і вага бяспружынных вагонаў таго і другога тыпу аднолькавы. Колькасьць месц для сядзеньня таксама аднолькава (24 месцы). У шырокім-жа вагоне праход шырэй, гэта дае магчымасьць карыстацца трамваем і з невялікім багажом. Разам з тым колькасьць месца для стаяньня ў шырокім вагоне больш, што асабліва важна ў часы ўзмацнёнага руху (з тэатру, на цягнік чыгункі, на службу і г. д.). У шырокім вагоне можна будзе зьмясьціць усяго 60 чалавек, а калі крыху пацясьніцца, як гэта назіраецца ў Маскве, дык і больш 60 чал.

Супроць шырокіх вагонаў можна прывесьці толькі адно меркаваньне што ў нас невялікая шырыня вуліц, але якіх небудзь 15-17 сантымэтраў вялікага значэньня мець ня будуць. Наогул трэба сказаць, што гэты тып трамвайных вагонаў стандартны і яго лягчэй і хутчэй можна атрымаць з заводу.

Частка абсталяваньня ўжо ў Менску, а рэшта заказана.

Як ужо нам вядома, рэйкі, шпалы, кастылі, падкладкі ўжо маюцца ў наяўнасьці на складах камгасу. Для пракладкі рэйкавага шляху трэба яшчэ наладзіць тэрмітавую зварку стыкаў рэяк. Ужо заключаны догавар з маскоўскім заводам і зварка забясьпечана ня толькі матар'ялам, але і рабочай сілай. Заказаны таксама гэтаму заводу стрэлкі і пераходы.

Здадзены таксама заказ на электраабсталяваньне і падвесачныя матар'ялы ГЭТ'у для кабельнай і другіх сяцей. Гэты матар'ял будзе дастаўлены ў лютым 1929 г. Мантаж падвесных ліній таксама перададзены ГЭТ'у, які абавязаўся зрабіць гэту работу ў працягу 50 рабочых дзён.

Трамвайныя вагоны заказаны ў ГОМЗ'е, пакуль што заказана для першай лініі 8 вагонаў. Апрача таго, заказаны маторы і ўсё электрычнае абарудаваньне для гэтых вагонаў.

Электрычная падстанцыя будзе зьмяшчацца ў будынку Менскай электрастанцыі. Ужо заказаны ртутныя выпрамніцелі, якія трансфарміруюць пераменны ток у сталы. Машыні для падстанцыі заказаны заграніцай. Атрымана згода НКГ Саюзу на выдачу ліцэнзій для ўвозу абсталяваньня.

Запрошаны ўжо кіраўнікі будаўніцтва.

Сёлета мяркуецца скончыць да канца будаўнічага сэзону пракладку лініі МББ—Камароўка. Для кіраўніцтва гэтай работай гарсавет запрасіў з Масквы П. І. Таўставухава, які ў працягу некалькіх дзесяткаў гадоў працуе на маскоўскім трамваі ў якасьці загадчыка вучастку службы шляху. Ён прымаў удзел і ў пабудове маскоўскага трамваю.

У сучасны момант т. Таўставухаў падбірае ў Маскве неабходны штат тэхнікаў, купляе неабходныя інструманты і ў Менск прыедзе 31 ліпеня для пачатку работ па пракладцы трамвайных шляхоў.

Апрача таго, са згоды кіраўніцтва маскоўскім трамваем запрошаны начальнік службы шляху маск. трамваю інжынэр т. Сасьянц, які ўзяў на сябе кіраўніцтва па будаўніцтву нашых шляхоў. У абавязкі т. Сасьянца будзе ўваходзіць зацьвярджэньне ўсіх чарцяжоў, якія будуць складзены т. Таўставухавым, распрацоўка ўсіх тэхнічных пытаньняў, маючых сувязь з пабудовай трамваю. Для ажыцьцяўленьня гэтага кіраўніцтва інжынэр Сасьянц будзе час ад часу прыяжджаць у Менск.

Праэкты, якія прадстаўлены акрвыканкомам, ужо разгледжаны ў двух камісіях сталага бюро трамвайных зьездаў і рашэньне гэтых камісій бліжэйшымі днямі будзе зацьверджана бюро.

Пабудова трамваю пачнецца ў канцы наступнага тыдню.

КАЛІ ПЕРАМАГАЕ ПРАЎДА.

Мядзьведзкі Паўла—бядняк, сваёй гаспадаркі ніякай ня мае, служыў у парабках. Але калі з усіх бакоў вораг пачаў насядаць на маладую савецкую рэспубліку, Паўла рашыў, што ён павінен пайсьці ў Чырвоную армію. Гэта было ў 1918 годзе. Рэспубліка была маладая, весь толькі нарадзілася, Чырвоная армія налічвала некалькі тыдняў існаваньня, а Мядзьведзкі быў таксама малады і таму ён яшчэ больш быў упэўнены ў сваёй перамове.

— Моладзь, казаў ён, больш санавітая і дужэй за трухлявых старыкоў, ды зноў-такі сьпяваюць «мы старое зруйнуем, ды новае пабудуем».

Мядзьведзкі прайшоў з Чырвонай арміяй увесь шлях яе ўзброенай барацьбы, а як скончыліся фронты ды наступіў тэрмін дэмабілізацыі, ён пайшоў да свайго камісара і спытаў:

— Франтоў няма, значыць у саветаў больш ворагаў няма.

У той час розныя Булак-Балаховічы, Махно, Цюцюнікі ды іншыя бандыцкія атаманы ды шайкі нападалі на савецкія гарады ды мястэчкі, і Мядзьведзкі атрымаў належны адказ камісара. Пайшоў у войска ДПУ для таго, каб зьнішчыць бандытаў—гэту каросту на целе Савецкай Дзяржавы. Толькі ў 1924 годзе сумленьне Мядзьведзкага дазволіла яму перайсьці на мірную працу і ён паехаў у Талочынскі раён, што на Аршаншчыне.

На разьвітаньне палітпрацаўнікі зноў тлумачылі яму, што дэмабілізаваны павінен прыняць актыўны ўдзел у працы свайго савету, што ён павінен выкрыць усе няправільнасьці, якія заўважыць, каб выцягнуць на чыстую ваду ўсякіх злачынцаў ды жулікаў. Мядзьведзкі сумленна ўзяўся за працу.

Ужо з першага дню ён заўважыў, што ваколічныя кулакі крыва на яго паглядалі, быццам нездаволены прыездам сьвежага чалавека. Тое самае ён заўважыў з боку цяперашняга сэкратара Булахоўскага сельсавету Янкі Ліцьвіненка, але ўсё яшчэ ня ведаў у чым справа.

Кажуць, чым больш жывеш, тым больш ведаеш, і Мядзьведзкі пачаў даведвацца аб злачынствах, што творацца ў яго сельсавеце. Ён даведаўся, што бацька члена сельсавету Ліцьвіненка гоніць самагон.

Ён пра гэта далажыў начальніку 5 раёну міліцыі, які выслаў 3 міліцыянэраў у вёску Муравічы і выкрыў самагон, але чамусьці ніякіх мер ня прыняў. Больш таго, пасьля гэтага Янка Ліцьвіненка, член сельсавету, быў абраны ў сэкратары, што яшчэ больш зьдзівіла акаляючую беднату. Можа гэта таму, што Янка быў камсамольцам, можа таму, што за гонку самагону толькі падзякуе дзяржава, але факт, што Ліцьвіненка атрымаў узнагароду —ён зрабіўся сэкратаром.

Мядзьведзкаму гэта было незразумела, а мясцовае кулацтва над ім толькі і хіхікала:

— Куды табе, бедняку, з намі брацца. За нас уся вёска, а ты што?

Мядзьведзкі быў вельмі абураны, але ня ведаў, што рабіць.

А паміж тым, Янка разгарнуў сваю дзейнасьць. Перш усяго, ён утаіў ад абкладаньня аб'екты свайго бацькі, а таксама і шэрагу кулакоў, якія з ім дачыненьні мелі. Паміж іншым, яго бацька за ўвесь час існаваньня савецкае ўлады ні разу падатку не плаціў. Другі кулак вёскі—Сіняўскі Хвёдар мае, шмат жывёлы, ды зямлі, а падатку таксама не плаціў. Больш чым два гады ён скупляе і перапрадае дзяржаўны лес, вельмі шырока паставіў сваю гандлярскую дзейнасьць, ня маючы на гэта ніякага права і дазволу, і таксама ніколі нічога дзяржаве не плаціў, бо працуе з сэкратаром сельсавету на паях. На кватэры сэкратара сельсавету абгаварваўся плян нападу на абшары рабочых чыгуначнікаў, якія пасьля былі абакрадзены, за што швагра сэкратара—Кіручынскі—сядзеў у аршанскім папраўчым доме. Усяго гэтага было мала для «дзейнасьці» Ліцьвіненкі і тады пачынаецца плянавы наступ на жыхара вёскі яўрэя Утвіцкага. Утвіцкі яшчэ 18 гадоў таму назад купіў у абшарніка 2 дзесяціны зямлі, з якіх ён уласна апрацоўвае паўтары дзесяціны, а на астатняй пабудавана цагельня, на якой працуе арцель рабочых. Пачынаецца адкрытае антысэміцкае цкаваньне.

— Ты-ж жыд, ня нашага вобчаства, каб тваёй нагі тут ня было.

Ліцьвіненка пагражае Утвіцкаму, што ён яму наогул забароніць працаваць. На чале гэтай антысэміцкай кампаніі зноў-такі апынуліся Сіняўскі і Ліцьвіненка. Мяжа паміж кулацтвам і сельсаветам зьнікае. Бедната глядзіць ды пазірае, баіцца ўлады Ліцьвіненкі, маўчыць.

У 1926 годзе антысэміты спалілі хлеў Утвіцкага. Гэта азначае пераход ад слоў да справы. Доўгі час вялося дазнаньне, усе сьляды сьцёрліся, кампанія высунула шмат сьведак, што яны не вінаваты і праўда зноў была пахавана.

Ліцьвіненка не задаволіўся сваім становішчам і для большага аўтарытэту падае заяву ў партыю. Ячэйка райкому прымае яго ў кандыдаты партыі і заяву яго перасылаюць на канчатковы разгляд акругкому.

Мядзьведзкі за гэты час зьвяртаўся амаль ва ўсе мясцовыя ўстановы, каб выкрыць злачынную дзейнасьць гэтае хэўры, але нічога ў яго ня выходзіла. Тады ён піша заяву т. Чарвяк ову:

«Я, як сумленны былы чырвонаармеец і Вы, як старшыня ЦВК, павінны супольнымі сіламі гэтых злачынцаў злавіць, бо Ленін яшчэ казаў, што даб'ёмся праўды, лепшай долі сваей уласнаю рукою».

Мядзьведзкі не памыліўся адрасам. Уся гэтая злачынная хэўра, што тэрарызавала на працягу шасьці год ваколічную беднату, зараз выкрыта. Усе факты, прыведзеныя ў заяве Мядзьведзкага, пацьвердзіліся. Пракурорам ужо ўзьнята крымінальная справа супроць Ліцьвіненка і Сіняўскага і іншых, хто па нядбайнасьці сваёй дазвалялі злачынцам у працягу гэткага доўгага часу весьці сваю, падрываючую аўтарытэт улады, працу.

Райком КП(б)Б, ухваліўшы гэтыя пастановы, не пасароміўся запрасіць назад з акругкому матар'ял па прыёме Ліцьвіненка ў партыю.

Праўда, урэшце, перамагае.

Мядзьведзкі выканаў даручэньне сваіх настаўнікаў.

Н. Ш.

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ.*)

Як прадукт імкненьня растлумачыць самому сабе найскладанейшыя зьявы прыроды, неспакушаны навукаю розум нашага продка-першабытнага чалавека стварыў паданьні і лягенды, у якіх няма размежаваньня паміж рэальнасьцю і фантастыкай...

Фантастыка імклівага розуму дапаўняла рэальнасьць, прыходзіла чалавеку на дапамогу, калі ён меў жаданьне даць тлумачэньне тэй ці іншай зьяве прыроды...

Як-жа наш прашчур, ня ведаючы, што парогі на Дняпры—гэта нешта іншае, як атрогі Карпацкіх гор, даў тлумачэньне іхняму зьяўленьню?.. Імклівы розум прашчура, аказваецца, ставіў перад сабою пытаньне:

— Скуль-жа ўзяліся парогі ў Дняпры?

Цяпер тлумачэньне нашых продкаў аб зьяўленьні парогаў сталася для нас прыгожай лягендай, сівым паданьнем, па зьместу якога мы можам гаварыць пра час зьяўленьня яго, можам нават бачыць тагочасныя сацыяльна-бытавыя абставіны насельнікаў-славян...

...Пад Кіевам, у Дняпры ўтапілі Пяруна-бога... Народ любіў свайго добрага бога, і шанаваў... Як дачуўся народ, што Пяруна ўтапілі ў Дняпры, адразу-ж прыляцела тысяча тысяч народу з адным жаданьнем—выратаваць яго з вады.

Уздоўж берагоў Дняпра ляцела многа, многа народу і сыпала ў Днепр пясок, каб памяльчэў стары,—так хацелася выратаваць Пяруна. І ўсё прасілі Пяруна:

— Выдыбай, божа! Выдыбай, божа! (Выплывай, ратуйся!).

А Днепр быў шырокі і глыбокі, і Пярун ня мог выратавацца, хоць ледзь-ледзь трымаўся на вадзе...

Падплыў Пярун пад Кадак, а тут берагі каменістыя. Узрадаваўся народ, што цяпер выратуюць Пяруна, і пачаў скалістыя берагі ламаць, ды камяньні кідаць у ваду—ратаваць Пяруна...

— Выдыбай, божа! Выдыбай, божа! —крычалі з берагоў...

Адзін парог зрабіў народ,—а вада прарвала яго і панесла з сабою Пяруна, другі парог зрабіў народ, а вада таксама прарвала і яго, і Пяруна з сабою панесла... Дзевяць парогаў так стварыў народ, усьцілаючы глыбокае, глыбокае дно вялізэзнымі каменьнямі, ратуючы свайго бога-Пяруна...

Але нічога гэта не дапамагло...

Не пасьпеў народ крыкнуць двойчы —Выдыбай!, як Пярун утапіўся, а замест яго вырас з вады вялізэзны, чорны камень. Народ так і назваў гэты камень «Выдыбаем», а іншыя звалі яго «Пяруном»...А ў «Выдыбай—камені» зьявілася зьмяіная нара, і ў ёй жыў дванаццаціголовы зьмей...

— Дык вось,—скончыў апавядаць нам народную лягенду аб зьяўленьні парогаў «бацька-лоцман»—здаравенны, тысачэзны, шыракаплечы, Андрый Білокінь-Хоцінкыч, наш лоцман з Кадаку,—ад таго, што народ сыпаў пясок ад Кіева да Кадаку—Днепр там і цяпер плыткі, а вось тут,—зьявіліся парогі—так кажа гэта паданьне, а чуў я яго ад старых людзей, ні то ў пацьверджаньне, ні то, каб паказаць нам, што ён ня верыць і не адказвае за праўдзівасьць тлумачэньня пра зьяўленьне парогаў,—дадае няпісьменны, шасьцідзесяціпяцігадовы лоцман...

* * *

А шостай гадзіне раніцы 30 чэрвеня мы былі ўжо каля дубу, на беразе Дняпра. Дуб—гэта дубовая, моцная даволі вялікая лодка з дзьвума парамі вёсел, з парусам.

Нас усіх 22. Лоцман, памоцнік лоцмана, трое грабцоў ды нас сямнаццаць.

— Сьцеражыся,—крыкнуў памоцнік лоцмана, падстаўляючы парус пад ледзь, ледзь чутны вецярок. І мы імчымся «на парусе» па Дняпру, уніз, к парогам...

— Дык, што-ж хлопцы! Начальства нам трэба абраць!—унесена прапанова.

Праяжджаць праз парогі, дзе патрэбен найвялікшы спакой і дысцыпліна, дзе гульлівы рух двух—трох свавольнікаў можа парушыць роўнавагу дубу і стварыць небясьпеку, якая нясе за сабою калі ня сьмерць удзельнікам, дык вялікія няпрыемнасьці—усё гэта казала пра неабходнасьць начальства.

Ну, вось і начальства абрана. Створаны ўрад у такім складзе: самага старага з удзельнікаў экскурсіі—Алеся Мікітавіча Вэдзьміцкага—абралі кашавым атаманам. Мяне, ад беларусоў, —судзьдзёй, Янку Момота—пісарам, а за «капітана»—старога лоцмана, бацьку Андрыя...

Песьня—адвечная спадарожніца моладзі. І слухае Дняпро нашу песьню.

Калі глядзіш на Днепр з берагу, калі едзеш на параходзе, ты яшчэ ня зусім адчуваеш тую прыгожасьць, якую захоўвае ў сваіх мяккіх водах Днепр. І зусім іншае захапленьне Дняпром, калі ты едзеш у звычайнай лодцы, калі так можна сказаць, знаходзішся ў «непасрэдных суадносінах» з прыродай... Узроку твайму не перашкаджаюць трубы параходу, пачуцьцяў тваіх не парушае гамонка і гул гораду...

За Днепрапятроўскам на Дняпры зьяўляюцца даволі вялікія хвалі, і рытмічна гойдаюць яны наш дуб, ліжучы барты яго сваімі гострымі верхавінкамі—грабеньчыкамі.

А лоцман, Андрый Білокінь пільна стаіць на варце, на рулю... Ён ведае, якую адказнасьць узяў на сябе, бяручыся правезьці нас праз парогі.

Кожная мясьцінка, кожны камень яму за сорак два гады лоцманства вядомы, і ён угля̄даецца на Днепр далёка-далёка наперад...

— Калі я лоцман, калі я ўзяўся правезьці праз парогі людзей, я павінен тут ужо памятаць, які камень мы сустрэнем за вярсту, за дзьве, каб своечасова скіраваць дуб—і гэтым папярэдзіць небясьпеку...

Мы разумеем, чаму такі спакойны зрок нашага старога лоцмана...

Наперадзе віднеецца вёска.

— Цэ Каменка,—кажа лоцман,— лоцманскае сяло. А чаму лоцманскае, а таму, што ў гэтым сяле жывуць лоцманы. Я заўважыў, што наш лоцман цікава гаворыць. Ён сам у сябе спытае сьпярша «чаму», а потым, зрабіўшы перапынак, адказвае.

— А ось камень Маскоўскі,—працягвае лоцман,—а чаму „маскоўскі", таму, што калі да казакаў, у Сеч, прыяжджалі маскоўскія людзі,—гэты камень быў для іх прычалам. Іх далей гэтага каменя на парогі ня пушчалі...

На высокіх кручах правага берагу Дняпра бачым сяло.

— Завецца гэтае сяло Стары Кадак, і жывуць у ім лоцманы, а яно парадзіла і Каменку і Днепрапятроўск...

Там, дзе неба сплываецца з Дняпром, на небасхіле першы парог. Прытоена слухаем гул. Наш дуб пачало больш падкідаць. Трэсачкай ён на непакойным Дняпры. Пачаліся «заборцы». «Заборцы»—гэта маленькія віркі, выкліканыя парогам.

Нас падхапіла плынь... Адчуваем, як ляцім уніз, нібы па ступеньках... Вада зносіць дуб, упарты руль лоцмана надае дубу патрэбны кірунак... Усе прытаіліся... Праяжджаем-жа праз парог... То сям, то там з-пад вады тырчаць гострыя каменьні. А што, калі паскочым на адзін з іх!.. Трэсьне дуб, і тады што рабіць, за што схапіцца...

Хлестанула вялізная хваля аб камень, абабіла свае бакі і з рэвам накінулася на нас... Хлестанула. Заліла нечакана вадою дуб, нас... Ныранула лодка яшчэ ніжэй на ступеньку і як страла кінулася наўцёкі ад праеханага намі Кадацкага парогу. Азірнуліся ўсе назад. На некалькі мэтраў мы ніжэй ранейшага ўзроўню вады...

— Ня так ужо і страшна!—асьмеліліся мы, вытрымаўшы баявое хрышчэньне.

А наперадзе яшчэ восем парогаў...
Магутная музыка песьні.
«Рэве тай стогнэ
Днiпр широкы»...
не знаходзіць сабе водгаласу сярод неабсяжных прастораў вады...

(Працяг будзе).

ІЛ. БАРАШКА.

*) Гл. «С. Б.» № 172.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб ліквідацыі Каапэрацыйных Саветаў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Беларускі Цэнтральны Каапэрацыйны Савет і акруговыя каапэрацыйныя саветы ліквідаваць.

2. Пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР за 12 ліпеня 1926 году «Аб Каапэрацыйных Саветах» (З. З. БССР 1927 г. № 30, арт. 147) — скасаваць.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Сташэўскі.

21 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о ликвидации Кооперативных Советов.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Белорусский Центральный Кооперативный Совет и окружные кооперативные советы ликвидировать.

2. Постановление Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР от 12 июля 1926 года „О кооперативных Советах" (С. З. БССР 1927 г. № 30, ст. 147) — отменить.

Вр. исп. об. Председателя Центрального Исполнит. Комитета БССР А. Хацкевич.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Сташевский.

21 июля, 1928 г.
г. Минск.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу Мазырскага Акруговага Выканаўчага Камітэту аб становішчы акругі і аб сваёй дзейнасьці і садакладу Народнага Камісарыяту Земляробства пра стан сельскае гаспадаркі на Мазыршчыне.

Заслухаўшы даклад Мазырскага Акруговага Выканаўчага Камітэту і садаклад Народнага Камісарыяту Земляробства аб умовах землякарыстаньня і землеўпарадкаваньня па Палесьсі (прат. СНК № 48, п. 654), Савет Народных Камісараў БССР, адзначаючы палепшаньне эканамічнага і культурнага становішча акругі, прызнае дзейнасьць і лінію ў рабоце Мазырскага Акруговага Выканаўчага Камітэту здавальняючай і канстатуе наступныя дасягненьні:

1. Устанаўленьне больш шчыльнай сувязі шырокіх рабочых і сялянскіх мас з органамі савецкае ўлады, стварэньне навакол саветаў актыву з рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і рост іх актыўнага ўдзелу ва ўсіх галінах савецкага будаўніцтва.

2. Некаторае пашырэньне пасеўнай плошчы і некаторы рост жывёлагадоўлі, павялічэньне валавай прадукцыі сельскае гаспадаркі і яе таварнае часткі, галоўным чынам — у галіне жывёлагадоўлі, пашырэньне калектывізацыі вёскі і сеткі сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

3. Правільны напрамак, узяты Акруговым Выканаўчым Камітэтам па разгортваньні прамысловасьці, базіруючайся на мясцовай сырызне, і некаторыя посьпехі ў сэнсе рацыяналізацыі і падняцьці вытворчасьці працы пры адначасным палепшаньні матар'яльных умоў рабочае клясы, а таксама некаторае пашырэньне сеткі саматужна-прамысловых каапэрацыйных аб'яднаньняў.

4. Здавальняючае выкананьне прыбытковай і выдатковай часткі мясцовага бюджэту, сваячасная і поўнае правядзеньне кампаніі па сельска-гаспадарчаму падатку, рост укладаў у касы ашчаднасьці, а таксама пасьпяховая рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі і здавальняючыя вынікі па самаабкладаньні.

5. Правільнае правядзеньне нацыянальнай палітыкі ў напрамку пераводу савецкага апарату на беларускую мову і забясьпечаньне эканамічнага і культурнага разьвіцьця нацыянальных меншасьцяй.

6. Узрост сеткі культурна-асьветных і лекавых установаў.

7. Узмацненьне і ажыўленьне дзейнасьці сельскіх саветаў і разгортваньне масавай работы гарадзкіх саветаў.

8. Некаторае дасягненьне ў правядзеньні рэжыму эканоміі, рацыяналізацыі савецкага апарату і скарачэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

II. Адначасна Савет Народных Камісараў адзначае наступныя недахопы:

1. Невыстарчальнае правядзеньне савецкай дэмакратыі ў саветах.

2. Недастаткова разгорнута дасьледчая работа па вывучэньні асаблівасьцяй прыроды і гаспадаркі Палесься.

3. Слабы тэмп меліарацыйных работ, недастатковы водпуск сродкаў на гэту мэту і няўвязка меліарацыйных мерапрыёмстваў з задачамі сельска-гаспадарчай калёнізацыі Мазыршчыны, як раёну слаба заселенага. Надзвычайна слабы тэмп землеўпарадкаваньня і нявывучанасьць асаблівасьцяй па зямельных адносінах. Неўрэгуляванасьць сялянскага землякарыстаньня ў лясной гаспадарцы, што шкодна адбіваецца на нармальным вядзеньні лясной і сельскае гаспадаркі, недастатковая разгорнутасьць аграномічных мерапрыёмстваў і слабасьць работы па разьвіцьцю жывёлагадоўлі. Слабае каапэраваньне сялянскіх гаспадарак навакол спэцыяльных відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

4. Нераўнамернасьць лясных насаджэньняў і неўпарадкаванасьць эксплёатацыі лесу, а таксама пры наяўнасьці вялікай колькасьці неаблесеных плошчаў і пяскоў, абсалютна недастатковыя размеры лесакультурных і лесамэліарацыйных работ.

5. Слабое разьвіцьцё прамысловасьці і зусім нязначныя капітальныя ўкладаньні як па галіне дзяржаўнай, гэтак і па мясцовай прамысловасьці; адсутнасьць зваротных сродкаў па мясцовай прамысловасьці; невыстарчальныя вынікі работы ў сэнсе зьніжэньня сабекошту прадукцыі прамысловасьці і выпадкі неплянаваньня будаўніцтва.

6. Адсутнасьць добрых грунтавых шляхоў зносін, а таксама заняпад і разбуранасьць водных шляхоў.

7. Вялікая культурная адсталасьць акругі, як спадчына мінулага, недастатковы ахоп школаю дзяцей школьнага ўзросту і слабыя вынікі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

III. Улічваючы прыродныя і гаспадарчыя асаблівасьці Мазырскай акругі, а таксама багатыя сыр'явыя і энэргетычныя рэсурсы Мазыршчыны, якія недастаткова выкарыстоўваюцца прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай, і прымаючы пад увагу вялікую культурную адсталасьць акругі, Савет Народных Камісараў БССР для ўзмацненьня тэмпу эканамічнага і культурнага будаўніцтва Мазырскай акругі прапануе ажыцьцявіць наступнае:

1. Даручыць Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры пабудове пяцігадовага пляну выдзеліць Палесьсе ў асобны гаспадарчы раён, з тым, каб распрацаваць шэраг мерапрыёмстваў па адбудове гаспадаркі і культуры акругі, прыцягнуўшы да гэтай работы Мазырскі Акруговы Выканаўчы Камітэт і зацікаўленыя наркаматы і дасьледчыя ўстановы.

2. Улічваючы вялікую колькасьць забалочаных зямель і пяскоў, ня ўцягнутых у сельска-гаспадарчы зварот, і магчымасьці ўтварэньня буйных калёнізацыйных фондаў, даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту ў межах пяцігадовага пляну распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы па ўзмацненьні тэмпу мэліарацыйных работ і па ўтварэньні на палескіх балотах і пясках калёнізацыйных фондаў з тым, каб практычнае ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыёмстваў распачаць не пазьней 1928-29 гаспадарчага году.

Адзначаючы слабы тэмп землеўпарадкаваньня і зусім нязначны процант землеўпарадкаванай плошчы, даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту разгарнуць землеўпарадчыя работы з такім разрахункам, каб на працягу сямі гадоў землеўпарадкаваць усю плошчу акругі.

Шырэй скарыстаць прыродныя водныя багацьці акругі з мэтаю больш шпаркага разьвіцьця інтэнсыўнай рыбаводнай гаспадаркі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на каапэраваньне сялянства ў гэтай галіне.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства пашырыць і надаць адпаведныя функцыі існуючай Скрыгалаўскай Вопытна-Дасьледчай Станцыі:

3. Запрапанаваць Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту, узмацняючы і паляпшаючы работу сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, асаблівую ўвагу зьвярнуць на разьвіцьцё спэцыяльных відаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі, дабіваючыся больш поўнага каапэраваньня сялянства і асабліва яго бядняцкай часткі. Прымаючы пад увагу цяжкае грашовае становішча Мазырскага Акруговага Саюзу С.-Г. каапэрацыі — даручыць Беларускаму Саюзу С.-Г. Каапэрацыі мець гэта на ўвазе пры разьмеркаваньні сродкаў з рэспубліканскага фонду саніраваньня с.-г. каапэрацыі, а Эканамічнай Нарадзе прасачыць за выкананьнем гэтае дырэктывы СНК.

4. Прымаючы пад увагу значную ролю лясной гаспадаркі, запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту ўзмацніць тэмп лесаўпарадчых і асабліва лесакультурных работ з тым, каб на працягу двух год скончыць лесаўпарадкаваньне, а таксама скласьці плян правільнай эксплёатацыі лесу, лесакультурных і мэліарацыйных мерапрыёмстваў.

5. Узмацніць работу па рацыяналізацыі работы існуючых прамысловых прадпрыёмстваў і па зьніжэньні сабекошту прадукцыі, павялічыўшы капітальныя ўклады ў прамысловасьць акругі, асабліва на будаўніцтва тых галін прамысловасьці, якія, грунтуючыся на мясцовай сыравіне, садзейнічаюць разьвіцьцю інтэнсыўных галін сельскай гаспадаркі. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі распрацаваць на працягу трох месяцаў пытаньне і разам з Мазырскім Акруговым Выканаўчым Камітэтам далажыць Савету Народных Камісараў аб магчымасьці пабудовы на Мазыршчыне каніфольнага заводу, мэблявай і паркетнай фабрыкі і іншых прадпрыёмстваў па пераапрацоўцы драўніны і сельска-гаспадарчай сыравіны.

У сьвязку з цяжкім становішчам зваротных капіталаў мясцовай прамысловасьці Мазырскае акругі — даручыць Эканамічнай Нарадзе пры разьмеркаваньні ў 1928-29 г. рэспубліканскага фонду мясцовай прамысловасьці ўлічыць неабходнасьць іх павялічэньня.

6. Запрапанаваць Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту ўзмацніць адбудову камунальнай гаспадаркі, у паасобку больш шырока разгарнуць жыльлёвае будаўніцтва. Пры складаньні крэдытных плянаў на 1928-29 год Эканамічнай Нарадзе і Беларускаму Камунальнаму Банку прадугледзіць павялічэньне сродкаў на адбудову камунальнай гаспадаркі г. Мазыру.

7. Дзяржаўнай Плянавай Камісіі і Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін прадугледзіць у пяцігадовым пляне будаўніцтва шосаў і адбудову водных шляхоў на Мазыршчыне. Даручыць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін на працягу месячнага тэрміну разьвязаць пытаньне аб замацаваньні берагоў ракі Прыпяці і аб будаўніцтве мазырскага ўзьбярэжжа.

8. Маючы на ўвазе вялікае эканамічнае значэньне праэктуемай да пабудовы на Мазыршчыне Паўднёва-Заходняй чыгункі, даручыць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін прысьпешыць практычнае ажыцьцяўленьне гэтага праэкту.

9. Улічваючы вопыт мінулых гаспадарчых кампаній, даручыць Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту даскональна распрацаваць загатоўчыя пляны, перагледзець і ўзмацніць сетку загатоўчых арганізацый, поўнасьцю правесьці кантрактацыю і ўжыць усе захады да сваячаснага і поўнага выкананьня загатоўчых плянаў, асабліва па экспартнай сыравіне. Народнаму Камісарыяту Гандлю і Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту распрацаваць на працягу месяца канкрэтныя мерапрыёмствы па ўзмацненьні кірмашовага звароту на Мазыршчыне.

10. Для больш хуткай ліквідацыі няпісьменнасьці і ажыцьцяўленьня пляну па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня даручыць Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту і Народнаму Камісарыяту Асьветы ўжыць усе захады да больш шырокага разгортваньня сеткі культурна-асьветных установаў і іх якаснага палепшаньня. Адначасна ўжыць захады да падняцьця самадзейнасьці насельніцтва ў галіне культурнага будаўніцтва.

11. Улічваючы невыстарчальнасьць мэдыцынскага абслугоўваньня насельніцтва і значную наяўнасьць сацыяльных і заразных хвароб (сухоты, пранцы, трахома, трасун), прызнаць неабходным пашырэньне і якаснае палепшаньне справы ахавы здароўя на Мазыршчыне.

12. Замацоўваючы і паглыбляючы маючаеся дасягненьне ў галіне масавай работы саветаў, Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту ў далейшай рабоце асаблівую ўвагу зьвярнуць на ўсямернае разьвіцьцё актыўнасьці рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі з пункту погляду ўзмацненьня кіруючай ролі рабочае клясы, накіроўваючы гэтую актыўнасьць на справу гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, строгае захаваньне савецкай дэмакратыі, шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, чутка прыслухоўваючыся да голасу мас і праводзячы рашучую барацьбу з бюракратызмам і цяганінай.

IV. Прымаючы пад увагу, што цяжкія ўмовы працы на Мазыршчыне перашкаджаюць Акруговаму Выканаўчаму Камітэту падабраць належны кваліфікаваны тэхнічны пэрсанал, даручыць Народнаму Камісарыяту Працы і Мазырскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту ў месячны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы па палепшаньні матар'яльна-бытавых умоў спэцыялістых на Мазыршчыне, пасьля чаго падаць на разгляд Савету Народных Камісараў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

4 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Галоўлітбел 302.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да прызыву 1906 г.

У верасьні месяцы па Менскай акрузе пачнецца чарговы прызыў у Чырвоную Армію гр-н 1906 году нараджэньня.

У сучасны момант ідзе праца па разгляду ільгот на сямейнаму і маемаснаму становішчу прызыўнікоў.

Гэта праца будзе закончана да пачатку прызыву.

Сёлета жараб'ёўка будзе праводзіцца па мэтаду мінулага году — завочная з удзелам абраных прадстаўнікоў ад прызыўнікоў.

Дзеля гэтага менскім акрваенкаматам ужо дадзены ўказаньні ўсім райвыканкомам акругі аб неабходнасьці выдзяленьня прадстаўнікоў ад прызыўнікоў 1906 г. для ўдзелу ў жараб'ёўцы.

У мэтах сваечасовай інфармацыі насельніцтва і прызыўнікоў аб прадстаячым прызыву і парадку жараб'ёўкі, у пэрыяд з 10-га па 20-га жніўня будуць праводзіцца па сельсаветах сходы насельніцтва.

На гэтых сходах запрапанавана паставіць даклады аб міжнародным становішчы і задачах Чырвонай арміі, а таксама аб ільготах і парадку жараб'ёўкі. Мясцам запрапанавана растлумачыць прызыўнікам, што завочная жараб'ёўка не пазбаўляе права кожнага прызыўніка цягнуць жрэбій асабова за сябе.

У сувязі з маючымiся ў мінулым годзе выпадкаў залічэньня ў кадравыя часьці Чырвонай арміі асоб ня маючых на гэта права, месцам запрапанавана правесьці належную раз'ясьняльную кампанію з мэтай выяўленьня асоб, якія ня могуць быць дапушчаны ў шэрагі Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

У часе праходжаньня самога прызыву пры кожным прызыўным пункце будуць арганізаваны ленінскія, справачныя сталы, перасовачныя бібліятэчкі і г. д.

Сёньня пачынаецца „Дзень чырвонай кветкі" — на дапамогу кітайскім рэвалюцыянэрам.

Сёньня, 28-га ліпеня, з 5 гадзін увечары па гораду Менску будуць праводзіцца скарбоначныя зборы, якія пойдуць на карысьць кітайскім рэвалюцыянэрам.

Скорбоначныя зборы працягнуцца таксама ўвесь дзень 29-га ліпеня.

Гэткія зборы будуць праводзіцца і па астатніх гарадох, раённых і сельскіх мясцовасьцях БССР.

У сувязі з кампаніяй, ячэйка Мопр'у ДПУ наладжвае сёньня, 28-га ліпеня, у садзе «Прафінтэрн» масавае гуляньне, збор ад якога пойдзе таксама на карысьць кітайскім рэвалюцыянэраў.

Да дню «Чырвонай кветкі», ЦК Мопр'у БССР выпусьціў адозву да працоўнага насельніцтва (у ліку 10.000 экзэмпляраў) з заклікам аб дапамозе кітайскім рэвалюцыянэрам.

Гэткія адозвы і лёзунгі расклеены па ўсім горадзе.

Арганізацыя беларускага аддзелу ў латвійскай дзяржбібліятэцы.

На днях Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка адправіла значную партыю беларускіх выданьняў для Латвійскай дзяржбібліятэкі.

Пры гэтай бібліятэцы арганізуецца пры дапамозе Белдзяржбібліятэкі спэцыяльны беларускі аддзел для абслугоўваньня беларускага насельніцтва Рыгі.

Паляпшэньне быту працоўных жанчын.

У сьвязку з пастановай Прэзыдыуму ЦВК БССР аб уключэньні ў бюджэт на 1928-29 г. асыгнаваньняў на мерапрыёмствы, зьвязаныя з паляпшэньнем быту працоўных жанчын, Інспэктарыятам па сацыяльнаму выхаваньню Нар. Кам. Асьветы БССР дадзены ўказаньні ўсім акруговым інспэктарыятам нар. асьветы аб адчыненьні на будучы год у кожнай акрузе новых дзіцячых садоў, ачагоў і пляцовак.

Апроч таго, запрапанована ўключыць у бюджэты сродкі на адчыненьне ў акругах курсаў па падрыхтоўцы працаўнікоў пляцовак і целы шэраг іншых мерапрыёмстваў.

Павялічэньне пэрсанальнай пэнсіі быўш. рэдактару газэты „Товарищ".

На сваім апошнім пасяджэньні Міжведамсьцьвенная камісія Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі БССР пастанавіла павялічыць пэрсанальную пэнсію да 120 руб. у месяц тав. Майзэлю.

Тав. Майзэль вёў актыўную падпольную працу, а таксама ў 1917 г. быў рэдактарам менскай бальшавіцкай газэты „Товарищ".

За невыкананьне работы — звальненьне з пасады.

За несваечасовае складаньне і паданьне ў Дзяржплян пляну сельскай электрыфікацыі БССР на 1927-28 г. зволен з пасады інспэктар па сельскай электрыфікацыі Наркамзему, інжынэр Паўлоўскі.

Рэалізацыя фруктаў савецкіх гаспадарак.

У бягучым годзе Белсельтрэст прыступае ў больш шырокім разьмеры да зготоўкі фруктаў у садох савецкіх гаспадарак.

Усяго мяркуецца рэалізаваць на ўнутраным рынку, апроч экспарту замежы, да 30000 пуд. яблык і груш.

Апроч таго, мяркуецца пераапрацаваць на сушыльных заводах да 40000 пудоў яблык.

Суд.

Кахаць ня прымусіш.

Фэлікс Аўласка родам з вёскі Васількоўка, Плешчаніцкага раёну ў апошні час служыў у гор. Барысаве і пазнаёміўся з дзяўчынай Ганнай Лукашэвіч.

Спачатку ўсё было добра. Аўласка вельмі часта наведваў Ганну, заляцаўся да яе, і Ганна Лукашэвіч з увагай адносілася да Фэлікса, ня гуляла з іншымі хлопцамі і на прапановы Аўласкі выйсьці за яго замуж нічога канкрэтнага не адказвала.

У сьнежні месяцы 1927 году на вечарыне Аўласка пачаў заўважаць, што Ганна Лукашэвіч калі-ні-калі пагульвае з іншымі хлопцамі і што яна зьвяртае менш увагі — аднак Аўласка часьцей пачаў гаварыць з Ганнай аб Загсе, але Лукашэвіч катэгарычна адмаўлялася.

Увечары 27 сьнежня 1927 году Аўласка, маючы дазвол насіць рэвальвэр, палажыў яго ў кішэню і накіраваўся да Ганны Лукашэвіч з аднэй мэтай канчаткова дагаварыцца наконт шлюбу, а пры адмове Ганны застрэліць яе і потым скончыць і сваё жыцьцё самагубствам.

— Добры вечар Ганна!

— Добры вечар.

— Як жывеш. А нішто, але сумую.

— Сумуеш? Цікава ведаць, чаго ты сумуеш?

— Ты, Фэлікс, не падумай, што па табе.

— Ведаеш што, Ганна, хопіць жартаваць, а давай раніцой пойдзем у Загс і зарэгіструемся.

— Не, я ў Загс не пайду.

Да гэтага часу Аўласка ня чуў такога дакладна-канкрэтнага адказу і гэты адказ так расхваляваў Аўласку, што ён рашыў пайсьці дахаты і болей з Ганнай ня сустракацца.

Калі Ганна Лукашэвіч выйшла за Аўласкам зачыніць вароты — Фэлікс Аўласка выхапіў з кішэні рэвальвэр і стрэліў у Ганну, але куля прайшла міма, хоць Ганна з перапалоху і палацела на зямлю.

Думаючы, што Ганна ня жыва, Аўласка зрабіў другі стрэл і параніў сабе адно вуха.

На судзе сказаў Аўласка: я кахаў Ганну і хацеў, каб яна не дасталася другому.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла: Фэлікса Аўласка на восем год зьняволеньня, але, прымаючы пад увагу яго хваравітае становішча і што ад злачынства цяжкіх вынікаў ня было, скараціў пакараньне да 2-х год і замяніў гэта пакараньне умоўным у працу на 3-х год.

Кастроў.

Менскі дзень.

Сёлета распачнецца праца па пабудове раённай амбуляторыі ў прывакзальным раёне. Зараз вырашаецца пытаньне аб месцы пабудовы. Магчыма, што амбуляторыя будзе будавацца на Савецкай вул. каля чыгуначнай царквы.

Пленум Менскага гарсавету пастанавіў прыняць шэфотва над № артпалком. Для прыняцьця шэфства ў лагер выедуць прадстаўнікі гарсавету.

Беларускімі школамі гораду Менску будзе ў новым навучальным годзе ахоплена каля 7500 дзяцей.

На грунтоўны рамонт Халопеніцкага нардому Менскі Акрвыканком дазволіў скарыстаць 500 руб. з адлічэньняў ад рэалізацыі сялянскай пазыкі.

Па 10.000 руб. адпусьціў Белсельбанк Гомельскай і Полацкай акругам дадаткова на крэдытаваньне сялянскай бядноты ў час пасяўной кампаніі.

2000 пуд. падсонечнага алею атрымаў гэтымі днямі Менскі ЦРК. Алей ужо разьмеркаваны па крамах цэрабкопу.

Ашчадная справа.

Водлуг дакладных даных Галоўнае Ашчаднае Касы ў Менску (Ленінская, 20) ашчадная справа ў Беларусі ў сучасны момант прадстаўляецца ў наступным выглядзе:

за чэрвень месяц г. г. укладчыкаў па Менскай акрузе прыбавілася на 1607 чалавек, укладаў — на суму 84.400 руб.

Па ўсёй Беларусі за чэрвень 1928 г. прыбавілася новых укладчыкаў — 6444 чалавек, укладаў — на 358000 руб.

На 1-ае ліпеня г. г. па БССР усяго укладчыкаў 100992 чал. на суму ўкладаў 5.707.000 руб.

Пераважным процантам у складзе ўкладчыкаў па сацыяльнаму становішчу зьяўляюцца рабочыя і служачыя. Пры бязумоўна павялічаным проц. укладчыкаў сялян, трэба, усё-ж сьцьвердзіць слабы рост сялянскіх укладчыкаў.

Ашчадным апаратам БССР праведзена пяцігодзьдзе юбілею дзяржаўных ашчадных кас, дашы 15.000 новых укладчыкаў і 775.000 руб. укладаў. Узята ўстаноўка на бліжэйшыя два месяцы на моцнае разгортваньне працы на вёсцы.

С. Э.

Землеўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Праца на Закодзкім калёнізацыйным фондзе, плошчаю ў 2760 гэктараў, распачалася ў першых лічбах мая м-ца г. г.

У бягучым годзе там праводзяцца землебудаўнічыя работы.

Зараз распачата правядзеньне плянавага будаўніцтва, для якой мэты Белазэтам ужо загатоўлены неабходныя лесаматэр'ялы.

На гэты калёнізацыйны фонд ужо перасялілася поўнасьцю 12 яўрэйскіх сем'яў.

На вясну 1929 г. намечана накіраваць дадаткова яшчэ 75 яўрэйскіх сем'яў.

Новы парадак разьмеркаваньня кватэр.

Кватэры ў першую чаргу будуць камгасам прадастаўляцца пацярпеўшым ад стыхійных бедстваў, пажараў, абвалаў і г. д. У другую чаргу прысяжным членам прафсаюзаў.

Камгас абавязаны інфармаваць пэрыядычна насельніцтва аб колькасьці асоб першай чаргі, каб зьнішчыць дарэмнае хаджэньне грамадзян па кватэрных справах. Утвараецца спэцыяльная камісія ў складзе 2 сяброў камунальнай сэкцыі і 1-го сэкцыі РСІ гарсавету. Камісія будзе правяраць правільнасьць выдаваемых ардэроў, а таксама разьбіраць скаргі на дзейнічаньне жыльлёвага стала.

Пэрсанальная пэнсія за баявыя заслугі.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі БССР пастанавіла павялічыць пэрсанальную пэнсію да 25 руб. у месяц партызану Бабруйскай акругі Гарбузу Міхасю.

Пэнсія павялічана тав. Гарбузу за баявыя заслугі ў партызанскіх атрадах.

Дзе будзе будавацца насосная станцыя.

Прэзыдыум Менскага гарсавету згадзіўся з пастановай камунальнай сэкцыі аб пабудове насоснай станцыі на рагу вул. Пуліхава.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы камітэтаў узаемадапамогі Менскай акругі.

У сучасны момант па раённых і сельскіх камітэтах узаемадапамогі Менскай акругі разгарнулася шырокая падрыхтоўчая праца да асеньняй сяўбы.

Усім раённым і сельскім камітэтам узаемадапамогі запрапанавана правесьці ў належны парадак усе пракатныя пункты і сельска-гаспадарчы інвэнтар, з тым, каб яны маглі быць перададзены сваечасова беднаце для запашкі палёў.

Адначасова з гэтым у час асеньняй сяўбы будуць арганізоўвацца трудгужарцелі з вясковага актыву для аказаньня дапамогі бясконным гаспадаркам, асабліва ўдовам, сем'ям чырвонаармейцаў і інвалідам грамадзянскай вайны.

Таксама будзе праводзіцца кампанія па каапэраваньню бядноты ў крэдытныя т-вы.

Да рамонту дамоў прыватнымі гаспадарамі.

Менскі гарсавет запрапанаваў Камгасу і гарадзкому архітэктару мець нагляд за выкананьнем дамаўласьнікамі ўсіх неабходных грунтоўных і бягучых рамонтаў.

У канцы будаўнічага сэзону спэцыяльная камісія правядзе абсьледаваньне выкананьня рамонтаў і ў выпадках невыкананьня пастановы гарсавету аб правядзеньні рамонту будуць прад'яўляцца судовыя іскі аб устанаўленьні бесгаспадарчага ўтрыманьня дамоў.

Мерапрыёмствы для палепшаньня забясьпечаньня Менску вадой.

У сучасны момант у розных месцох гораду ўтвараюцца работы па дасьледу новых крыніц вады для забясьпечаньня насельніцтва Менску. Ужо вырыта адна скважына ў гарадзкім садзе.

На тэрыторыі Эльводу пабудаваны два новых бруклінаўскіх калодзежы глыбінёй на 40 мэтраў. Зьніжаны маторы для адкачкі вады і ўжо скончана работа па пабудове рэзэрвуару на 50.000 вёдзер вады. Унача гэты рэзэрвуар будзе напаўняцца вадой, а зранку, калі патрэба ў апошній павялічваецца, гэта вада будзе падавацца гораду.

У фонд абароны краіны.

У Менскі акрсавет ТДА-Авіяхіму паступіла ад ячэйкі ТДА-Авіяхіму заводу «Варшавянка» 23 руб., ад ячэйкі ТДА-Авіяхіму ЦВК і СНК — 42 р. і ад ячэйкі Нар. Камгандлю — 37 р. 25 к.

Усе гэтыя сродкі паступяць у фонд абароны краіны.

Буйны рост фабрыкі „Меншвэй".

За апошнія тры гады фабрыка «Меншвэй» моцна ўзрасла. У 1925-1926 г. «Меншвэй» рэалізаваў сваёй прадукцыі на 716 тысяч руб. Рабочых у гэты год працавала 187. У 1926-1927 г. фабрыка рэалізавала ўжо тавару на 1.175.000 руб. — з лікам рабочых 244 чалавекі, у 1927-28 г. на — 1 796.000 руб. — з лікам рабочых 357 чалавек. На 1-га чэрвеня бяг. году пасьля таго, як увялі дзьве зьмены, на фабрыцы было занята 600 рабочых, а прадукцыя вырасла больш, чымся ў два разы.

Гэты буйны рост «Меншвэя» за апошнія годы тлумачыцца, галоўным чынам, арганізацыйна-гаспадарчымі палепшаньнямі, якія зрабілі ўплыў на ўвесь ход прадукцыйнага працэсу фабрыкі. У канцы 1926 году на фабрыцы ўвялі сыстэму падзяленьня працы. Гэта дало магчымасьць дасягнуць вялікіх станоўчых вынікаў, хоць тэхнічнае палепшаньне было ня вельмі значнае.

«Меншвэй» выканаў на ўсе 100 проц. дырэктыву партыі і ўраду аб зьніжэньні цэн. У 1926-27 г. продажныя цэны зьніжаны да 10 процантаў, пры гэтым зьніжэньне было праведзена не за кошт прыбытку фабрыкі, а за кошт зьніжэньня сабекошту прадукцыі.

Сабекошт прадукцыі складаецца з 3-х галоўных артыкулаў: сыравіны, рабочае сілы і адміністрацыйных выдаткаў.

Адміністрацыйныя выдаткі, дзякуючы таму, што звароты фабрыкі моцна ўзрасьлі, значна зьменшыліся. Лік служачых увесь час зьмяншаўся. Так, у кастрычніку 1926 г. лік служачых дасягаў 25 проц., у кастрычніку 1927-28 г. — 21 проц., а ў сакавіку бяг. г. — 15 проц. З гэтае прычыны сабекошт сучаснага году проці мінулага зьменшыўся на 5 проц.

Другі момант, які зрабіў уплыў на зьніжэньне сабекошту, гэта зьніжэньне цэн на сыравіну. Дзякуючы таму, што цэны на мануфактуру і тэкстыльныя тавары зьменшаны, была магчымасьць зьнізіць сабекошт на 5 проц.

Трэці момант, які дапамагаў зьніжэньню сабекошту, — гэта падзяленьне працы. У выніку гэтага выпрацоўка кожнага прадукту на фабрыцы вымагае ўсё меней і меней часу, і таму ўся прадукцыя каштуе таньней.

Адначасова сярэдні заработак рабочага ўзрос. Сярэдні заработак рабочага ў 1 квартале 1927 г. складаў 3 р. 64 кап. у дзень, а ў 4 квартале ён дасягнуў 4 р. 55 кап.

Аказалася, што пасьля пераходу фабрыкі на сыстэму падзяленьня працы якасьць прадукцыі пагоршылася. Дзякуючы сваечасовым энэргічным мерам, якасьць выпрацоўваемага тавару зноў узьнялася, хоць яшчэ і ў недастатковай меры. Не хапае для гэтага неабходных машын.

З тае прычыны, што колькасьць рабочых, асабліва за апошні год, моцна ўзрасла і памяшканьне фабрыкі стала нездавальняючым, паўстала пытаньне аб пабудове новай фабрыкі. Дзяржплян і Савет Народнае Гаспадаркі ўжо зацьвердзілі каштарыс на пабудову новай фабрыкі.

Спачатку ў новай фабрыцы будуць працаваць 2 зьмены рабочых у колькасьці 1200 чалавек з штогоднай праграмай на 10 мільёнаў руб. Потым фабрыка пяройдзе на сыстэму 3 зьмен, з колькасьцю рабочых 1500 чал. Фабрыка будзе абсталявана навейшымі машынамі, на што ўжо адпушчана 30 тысяч руб.

Э.

Экспарт птушак неабходна ўпарадкаваць.

Адзін з хворых момантаў нашага экспарту — слабая якасьць таго ці іншага віду тавару. Часта, ганяючыся за колькасьцю, зусім забываем пра якасьць. У выніку чаго ўзьнікаюць вялікія непаразуменьні і ўтвараюцца значныя страты. Аб гэтым ужо шмат пісалі, але ў сучасны момант, калі пара рыхтавацца да экспарту жывых гусей і інш. хатніх птушкі, пытаньне аб якасьці гэтага тавару паўстае з усёй яго вострасьцю.

Экспарт жывых, а таксама і бітых гусей займаў у даваенны час вялікае месца. Дзяржгандаль Беларусі распачаў вываз гусей з 1923 г., калі ў пачатку працы былі якія-небудзь дэфэкты, калі адсутнічаў вопыт, ня было практыкі ў гэтай справе, дык зробленыя памылкі былі, зразумела, дапушчальны; але цяпер, калі загатоўкай гусей і іх экспартам займаемся ўжо амаль 5 гадоў, дык нельга дапушчаць, каб старыя памылкі паўтараліся. Вельмі шмат гаварылі ў свой час аб племяннай птушцы, але да апошняга часу ў гэтых адносінах нічога ня зроблена. Сяляне Жлобінскага раёну, багатага гусямі, зьвярнуліся ў РВК і іншыя інстанцыі з просьбай даставіць ім племянных птушак дзеля палепшаньня якасьці нашай беларускай птушкі. З другога боку, трэба заўважыць, што экспарт гусей праводзіўся неяк хаотычна, без сыстэмы, і ясна, што вынікі былі ня вельмі спрыяючыя.

Для палепшаньня якасьці тавару Белдзяржгандаль наладзіў у Жлобіне, каля возера «Вір», птушніцкі камбінат. Бязумоўна, створаны камбінат адыграе значную ролю ў палепшаньні рэнтабельнасьці экспарту гусей, бо гусі будуць канцэнтраваны ў адным месцы, падвоз харчоў будзе значна палегчан (водным шляхам), збор гусей будзе праходзіць плянава.

Нашым экспарцёрам неабходна памятаць аб урэгуляваньні транспарту пры вывазе гусей; неабходна загадзя падрыхтаваць спэцыяльныя птушніцкія вагоны ў патрэбнай меры.

Па дарозе ад Жлобіна да станцыі назначэньня неабходна арганізоўваць кармленьне. Калі гэта ўсё будзе ажыцьцёўлена, дык можна з упэўненасьцю сказаць, што рэалізацыя гусей на замежных рынках значна будзе палегчана.

Якасьць тавару, яго ўпакоўка, правільная сартыроўка куды важней за колькасьць, аб гэтым трэба стала памятаць, дык нам ужо пара навучыцца пасылаць за граніцу тавары, адпаведна патрабаваньням рынку.

А. Манін.

ШАШКІ № 12.

Пад рэд. А. Каспэрскага

Эцюд Я. Фэльдмана — Менск.

Друкуецца першы раз.

Бел. ш.ш. а3, с7, f2

Чорн. ш.ш. с3, f4, g5

Белыя пачынаюць і выйгрываюць.

Партыя іграна ў чэмпіянаце Менску.

Бел. — Прэсман Чорн. — Элье.

1. c3-b4 f6-e5, 2. e3-f4 g7-f6, 3. b2-c3 b6-c5, 4. b4-a5 f6-g5, 5. c3-b4 — 6. d2:f4 e7-f6, 7. f2-e3, f8-g7, 8. c1-b2 e5-d4, 9. g1-f2 f6-e5, 10. b2-c3 — 11. a1:c3 g7-f6, 12. c3-d4 — 13. — d8-e7, 14. g3-h4 d6-e5, 15. f2-g3 e7-f6, 16. d2-c3 h8-g7, 17. a3-b4! — 18. e1-d2 d6-c5! 19 — — 20. g3-f4 c7-b6, 21 — — 22. c3-d4 a7-b6, 23. h4-g5 — 24. d4-e5 h4-g3, 25. — — 26. e3-f4 — 27. h2:f4 g7-f6, 28. d2-e3 f6-g5, 29. f4-e5 g5-h4, 30. e3-f4 h6-g5, 31. — h4-g3, 32. h6-g7 g3-f2, 33. g7-f8 c5-d4 — f2 g1 — нічыя.

Цікавая партыя!

Вынікі гульні ў астатніх турах: Прэсман — Гардонічыя. Прэсман +1½ у Эльі, Гардон — Бэрман — нічыя, Бэрман +2 у Эльі, Эльі +1 у Вакштэйна, Дворкін +1 у Бэрмана і Юршчык В. Каспэрскі — нічыя.

Лідэры Прэсман і Гардон не прайгралі ніводнае партыі.

Становішча:

1) Прэсман	+10	—3
2) Гардон	+8½	—3½
3) Вакштэйн	+8½	—5½
4) Бэрман	+9½	—6½
5) Дворкін	+6	—7
6) Эльі	+7½	—8½
7) Гаркевіч	+3½	—4½
8) Юршчык	+4	—7
9) Каспэрскі	+4	—8
10) Эпрінгер	+2½	—5½
11) Ліхадзеўскі	+2	—7

Наступны тур 30-VII.

Водгукі па допісы.

— Па заметцы „Грошы марнуюць" («С. Б. № 149 30-VI-28 г.) было зроблена расьсьледаваньне, якім устаноўлена, што грамадзяне ў вёсцы Трухановічы пастаўлены 1-VII, а грошы на пабудову сямігодкі пераведзены райвыканкому, які ў сучасны момант закупае ў лясьніцтве дрэва.

— Па допісу «Мае прыгоды» («С. Б.» № 92 20-IV 28 г.), у якім дапісчык — пайшчык МЦРК скардзіўся на тое, што яму не хацелі прадаць гарнітур, пакінуты загадчыкам крамы для сябе, нас паведамілі, што за гэты ўчынак загадчыку крамы № 61 т. Бесіну абвешчана строгая вымова.

— У «С. Б.» быў зьмешчан допіс пад загалоўкам „Сабраліся, пагаварылі і сьпяць". У допісе гаварылася аб слабай працы Каралінскага с-с. па рэалізацыі пазыкі.

Дазнаньне фактаў указаных у допісе не падцьвердзіла.

— Па пытаньню, закранутаму ў допісе «Каму належыць — растлумач» Магілеўскі РВК паведамляе, што ў пастанове НКЮ ня ўказана, што ў раённай міліцыі ўводзіцца пасада ст. дзелавода, а толькі ўказана, што стаўка ст. дзелавода ў раённых установах 35 руб.

Пытаньне аб увядзеньні ў 27-28 г. у раймiліцыях пасад ст. дзелаводаў ні ў акрузе, ні ў Менску не падымалася і ў бюджэце зацьверджаны пасады мал. дзелаводаў.

Магчымасьці да здавальненьня закранутага ў допісе пытаньня няма, бо тады трэба зьмяніць штатную пасаду і складаць дадатковы каштарыс на выклікаемы гэтым расход.

— Па допісу „Гэрой Чаркасаў" („С. Б." № 160 20-VII). Пленум аршанскага акруговага суду, 7-IV-28 г. заслухаўшы акт рэвізіі члена акруговага суду, пастанавіў перадаць справу пракурору для правядзеньня дазнаньня і адданьня Чаркасава пад суд.

Паштовая скрынка.

Т. Хадкевічу. Ваш допіс аб землеўпарадкаваньні накіраваны ў Аршанскі земаддзел на дасьледаваньне.

Райвнаму. Ваш допіс «Дасьледчык» перасланы ў газэту „Беларуская Вёска".

Т. К. Допіс «Схаваную зямлю трэба выкрыць» накіраваны ў Чачэвіцкі райвыканком.

Апавяшчэньне.

САД ПРАЦ. АСЬВЕТЫ.

Сёньня, кіно: „Парыж Заснуў". Пачатак а 10 гадзіне. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў клюб.

Білеты ад 10—15 кап.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

НА ЎСЕСАЮЗНУЮ СПАРТАКІЯДУ.

Вэлёсыпэдны зьвёздны прабег.

На гэтых днях у Менску будзе дан старт камандзе з 8 чалавек, якая ўдзельнічае ў вэлёсыпэдным зьвёздным прабегу Менск — Масква. Вэлёсыпэдысты павінны прыбыць у Маскву к пачатку Ўсесаюзнай спартакіяды.

160 лепшых фізкультурнікаў Беларусі — у Маскву.

Прэзыдыум ВСФКБ канчаткова зацьвердзіў склад каманды Беларусі, якая будзе камандыравана ў Маскву на ўсесаюзную спартакіяду. Каманда складаецца з 160 лепшых фізкультурнікаў ад усіх акругаў Беларусі. Большасьць удзельнікаў дае Менская і Гомельская акругі.

Падрыхтоўка лёгка-атлетаў і футбалістаў.

Трэніроўка футбалістаў зборнай каманды Беларусі, якая паедзе на спартакіяду, пачнецца ў нядзелю 29 ліпеня ў Гомелі. Для матчаў у Гомель выкліканы каманды Харкава, Бранску і Кіева.

Трэніроўка лёгка-атлетаў адбудзецца ў Менску.

Плякаты спартакіяды.

ВСФКБ атрымала ад аргкамітэту ўсесаюзнай спартакіяды 2000 мастацкіх плякатаў аб спартакіядзе, якія разасланы па Беларусі дзеля шырокага абвяшчэньня і папулярызацыі ўсесаюзнай спартакіяды сярод шырокіх колаў насельніцтва Беларусі.

Ад Менску на ўсесаюзную спартакіяду — 50 чал.

На ўсесаюзную спартакіяду ў Маскву будзе камандыравана 50 фізкультурнікаў. Пасяджэньне гэтай каманды адбудзецца ў нядзелю, 29 ліпеня, а 1 гадзіне на пляцоўцы «Прафінтэрн».

ТЭАТР — КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	Ад аўторка — 24 ліпеня Новы бытавы фільм „МЯРЭЖЫ" (кружэва) У 7 частках.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Савецкі мастацкі фільм АМОК трагэдыя ў 6 частках. па раману Л. Цвэйга Пачатак у 7 з палав. гадз.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Выдатны савецкі фільм ХТО ТЫ ТАКІ? Драма ў 6 частках.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Замежны фільм МАРСКІ ЯСТРАБ Кіно-раман у 9 частках.

Беларуская Раённая Кантора УКРАІНЛЕСА абвяшчае на 1-га жніўня а 10 гадзіне раніцы на ст. КРУПКІ

ЗЬМЕШАНЫЯ ТАРГІ

на продаж цэмантнай клёпкі ў колькасьці 462 к-м., якая знаходзіцца на ст. КРУПКІ МББ чыгункі балянсавым коштам 4902 р. 50 к.

Да таргоў дапушчаюцца дзяржаўныя ўстановы, грамадзкія і каапэрацыйныя арганізацыі, а таксама прыватныя асобы.

Ня вызваленыя ад закладу павінны ўнесьці перад таргамі заклад у разьмеры 10 проц. кошту тавару.

Усе спраўкі і аглядаць клёпку можна штодня на ст. КРУПКІ МББ чыгункі ў супрацоўніка Украінлеса тав. ЗРУБОВІЧА.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вучотна-конская кніжка Бурага А. А., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Моніча В. Г., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Горбача Д. А., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Лужыка А. Г., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Селівіча Ф. Ф., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Каптура В. Т., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Вучотна-конская кніжка Барысава К. Г., выд. Крупскім РВК, кв. 725.

— Сяброўскі білет № 127235 Галавана Н. выд. саюзам прац. зямлі і лесу, к-913.

1-я удркарня.